ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 55 (2221)
12 ліпеня 1968 г. ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

НІКОМУ ЯШЧЭ не ўдалося даказаць, што самае сіняе мора прыгажэй за наша возера Нарач, што пад пальмамі ды кіпарысамі дыхаецца лягчэй, чым у сасновым бары, дзе паветра настоенае на лясных пахах, бы той бальзам...

Што? Кожны кулік сваё хваліць? А вы зайдзіце ў Рэспубліканскі савет па турызму і пацікаўцеся заяўкамі.

— Шлюць і шлюць,—уздыхае намеснік старшыні савета Барыс Фёдаравіч Чарноў,— а даўно ўжо няма ніводнай пуцёўкі.

— Адкуль заяўкі?

— З усіх куткоў краіны — з Архангельска, Масквы, Камчаткі, нават з Каўказа...

— Каўказа?

— Вось, зірніце, — з Арменіі і Грузіі.

— Колькі чалавек прымуць сёлета турбазы рэспублікі?

— Больш за 70 тысяч. Акрамя таго, работа турысцкіх баз спланавана зараз такім чынам, што ў выхадныя дні палавіна месц адводзіцца для прыёму адпачываючых па адна-двухдзённых пуцёўках. Сёлета па пуцёўках выхаднога дня адпачне 25 тысяч чалавек. З кожным годам у нас становіцца больш і турысцка-аздараўленчых лагераў, якія ствараюцца прадпрыемствамі, установамі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Летась у рэспубліцы было 75 такіх лагераў, у якіх адпачыла больш як 50 тысяч чалавек. Сёлета створана ўжо больш за 90.

— І тым не менш пуцёўку дастаць вельмі цяжка...

— Так, усіх жадаючых мы задаволіць пакуль што не можам. Стрымлівае матэрыяльная база. Арганізацыя наша багатая, грошы ёсць, але падводзяць будаўнікі. Вельмі марудна ўзводзіцца, напрыклад, гасцініца «Турыст» у Мінску. Чатыры гады ўжо будуецца турбаза на Браслаўскіх азёрах, прайшлі ўсе тэрміны здачы турысцкай гасцініцы ў Брэсце, на Нарачы і г. д. Але гэта яшчэ не ўся бяда. Мы вельмі бедныя на турысцкі рыштунак. У рэспубліцы 300 пракатных пунктаў, але там заўсёды чарга — не хапае турысцкіх палатак, спальных і рэчавых мяшкоў і г. д. Мы не можам дабіцца, каб у рэспубліцы пачалі вырабляць розны турысцкі інвентар. Амаль усё прыходзіцца завозіць. А транспарт? Ведаеце, у нас няма ніводнага аўтобуса «Турыст», на якім можна было б рабіць далёкія падарожжы. Ну, і яшчэ дарогі... Ох, дарогі... Пакуль даедзеш, скажам, да Браслаўскіх азёр, дык так натрасешся...

Я кажу Барысу Фёдаравічу, што некалькі гадоў назад у друку абмяркоўваўся спосаб падарожжа па так званым «аўтастопе». Гэты спосаб набыў шырокае распаўсюджанне ў рэспубліках Прыбалтыкі. А ў нас?

— Я таксама гарачы прыхільнік «аўтастопа», — кажа Б. Чарноў. — Купіў чалавек за рубель кніжачку з адрыўнымі талонамі і, калі ласка, падарожнічай. Любая машына, калі толькі гэта не маршрутны аўтобус ці таксі, ну і вядома прыватны аўтамабіль, падбярэ цябе на першым знаку...

— Ці так ужо па першым?

— Ёсць на гэты конт распараджэнне міністра аўтатранспарту... Але, усё роўна, чамусьці «аўтастоп» не вельмі прывіваецца... Можа таму, што рэкламуецца гэты спосаб даволі слаба?

У рэспубліцы вельмі развіты, калі можна так сказаць, самадзейны турызм. Гэта паходы школьнікаў і студэнтаў па месцах баявой і працоўнай славы, па родным краі. Мы забяспечваем іх турысцкім інвентаром, даём інструктараў і г. д. Летась у такіх паходах пабывала 1,5 мільёна чалавек.

— Турысцкі побыт — гэта, відаць, не толькі рамантыка начлегаў ля ляснога вогнішча, гэта яшчэ і экскурсіі ў музеі, наведванне памятных мясцін і г. д.?

— У 1965 годзе нам было перададзена Мінскае экскурсійнае бюро, якое раней належала таварыству «Веды». Зараз экскурсійныя бюро ёсць ва ўсіх абласных гарадах, а таксама ў Бабруйску, Полацку, Оршы, Лідзе, Мазыры.

Прывяду некалькі характэрных лічбаў. Летась, напрыклад, у розных экскурсіях і экскурсійных падарожжах у рэспубліцы прыняло ўдзел больш за 600 тысяч чалавек, сёлета прыме не менш 800 тысяч. Гэта ў пяць разоў больш, чым было тры гады назад. Шэсць гадоў назад у нас быў арганізаваны першы турысцкі цягнік па дарогах Прыбалтыкі. А ўжо летась па розных гарадах і раёнах краіны курсіравалі 23 нашыя спецыяльныя турысцкія цягнікі. Сёлета будзе адпраўлена 30 турысцка-экскурсійных цягнікоў, на якіх будуць падарожнічаць каля 15 тысяч чалавек. Вялікім попытам карыстаюцца так званыя цягнікі выхаднога дня. У гэтым годзе такія паездкі былі ўжо арганізаваны для рабочых Аршанскага льнокамбіната ў Брэст, для працоўных Фрунзенскага раёна Мінска — у Ленінград, для сельскіх працаўнікоў Бабруйшчыны — у Мінск і г. д.

Праўда, тут ёсць адно «але». Для такіх падарожнікаў мы прыстасоўваем звычайныя вагоны. І, вядома, пабыць у дарозе пяць-шэсць дзён даволі цяжка — ні памыцца, як след, ні адпачыць. Мы хадайнічаем, каб у такім цягніку быў ва-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

БЕЛАРУСЬ ТУРЫСЦКАЯ

На пытанні карэспандэнта «Літаратуры і мастацтва» адказваюць намеснік старшыні Беларускага савета па турызму Б. ЧАРНОЎ і кіраўнік Беларускага аддзялення Усесаюзнага акцыянернага таварыства «Інтурыст» А. СЯМАШКА

14 ЛІПЕНЯ — ДЗЕНЬ РЫБАКА

У нядзелю, 14 ліпеня, у нашай краіне адзначаецца Дзень рыбака. Відаць, свята гэтае лічаць сваім і тыя, хто хоць раз цікаваў над рачной кручай за мітуслівым паплаўком, а пасля, седзячы ля вогнішча, смакаваў пахучую рыбацкую юшку і слухаў дзівосныя рыбацкія прыгоды. Можна, канечне, зразумець гэтых людзей (тым больш, што іх шмат, заўзятых і не вельмі заўзятых рыбакоў-аматараў). Але ўсё ж куды большае і ўрачыстае гэта свята для сапраўдных рыбакоў, для людзей мужнай і небяспечнай прафесіі, для людзей, асіяваных сямю вятрамі і прасоленых водамі чатырох акіянаў.

У Беларусі няма мораў. Але ёсць затое безліч азёр і сініх рэк. І ёсць патомныя рыбакі. І ў нядзелю да іх, як і да ўсіх рыбакоў краіны, прыйдзе свята. Прыйдзе яно, канечне ж, і на берагі Нарачы — славутага беларускага мора, у якім ловіць рыбу, у тым ліку каштоўнага вугра, матарыст, нашчадак слаўных нарачанскіх рыбакоў Віктар Лапцін.

Фота Л. ПАПКОВІЧА.

СЕМІНАР ТВОРЧАЙ МОЛАДЗІ ВІЦЕБШЧЫНЫ

Над возерам Суя, у гушчыні сасновага бору ўзвышаецца прыгожы белакаменны палац — прафілакторый Полацкага завода шкловалакна. Цэлы тыдзень гаспадараць у ім маладыя літаратары, мастакі, кампазітары, музыканты-выканаўцы Віцебшчыны, удзельнікі другога абласнога семінара маладой творчай інтэлігенцыі.

Першы семінар адбыўся год назад. За гэты час пры абкоме камсамола створана творчае аб'яднанне маладых «Вяснянка». «Вяснянка» сабрала ў сваіх радах дзесяткі маладых талентаў. Яна з'явілася арганізатарам цікавых творчых сустрэч з рабочымі і студэнтамі Віцебска, будаўнікамі Наваполацка і Лукомльскай ДРЭС, выставак, канцэртаў, дыспутаў. Аб усім гэтым расказала ў сваім уступным слове на семінары сакратар абкома камсамола Тамара Ішчанка.

На семінар члены «Вяснянкі» прывезлі свае новыя творы. Добрую ацэнку атрымалі вершы Марыі Баравік, Алы Красінскай, Вольгі Івановай, Алеся Шпыркова, Алены Ніякоўскай. Свежасцю, пошукамі новага прасякнуты музычныя творы кампазітара Якава Касалапава, Барыса Насоўскага, Аркадзя Гомана і іншых. На выстаўку, што арганізавана на семінары, прывезлі свае новыя карціны маладыя мастакі Генадзь Шутаў, Людміла Воранава, Адольф Барановіч, Уладзімір Федаровіч і іншыя. Цікавасць выклікалі мастацкія фотаэцюды Эдуарда Трапачука.

Дапамагчы маладым прыехалі пісьменнікі Алесь Асіпенка і Давід Сімановіч, кампазітар Кім Цесакоў, мастацтвазнаўцы Генадзь Ратнікаў і Гурый Барышаў.

Удзельнікі семінара выступілі з творчымі справаздачамі перад працоўнымі Полацкага і Ушацкага раёнаў.

Семінар працягваецца.

У. ТАНІН.

У ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Адбыўся адкрыты партыйны сход Саюза пісьменнікаў БССР, на якім абмеркаваны стан, формы і метады прапаганды беларускай літаратуры ў юбілейным годзе. Даклад зрабіла член партбюро Е. Лось.

З прапановамі і заўвагамі выступілі пісьменнікі М. Чавускі, А. Кулакоўскі, І. Шамякін, Н. Пашкевіч, С. Шушкевіч, П. Кавалёў, А. Бачыла, Я. Крупенька, рэферэнт таварыства «Веды» В. Султанаў, інструктар ЦК КПБ Ж. Сінельнікава. У рабоце сходу прыняла ўдзел сакратар Ленінскага райкома партыі Р. Пілёнава.

Па абмеркаванаму пытанню прынята пастанова.

МУЗЕЙНЫЯ РАБОТНІКІ ВУЧАЦЦА

Учора ў Мінску закончылі сваю работу дзесяцідзённыя курсы-семінар работнікаў музеяў рэспублікі, скліканыя Міністэрствам культуры БССР. На курсы-семінар былі запрошаны дырэктары музеяў — рэспубліканскіх, абласных і раённых, навуковыя супрацоўнікі аддзелаў гісторыі грамадства, работнікі фондаў, інспектары па музеях і помніках абласных упраўленняў культуры, актывісты музеяў народнай славы — усяго каля 100 чалавек.

Аб ролі музеяў у камуністычным выхаванні працоўных і ў падрыхтоўцы да 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі гаварыў ва ўступным слове міністр культуры БССР М. Мінковіч.

Удзельнікі курсаў-семінара праслухалі цыкл лекцый кандыдата гістарычных навук А. Сідарэнкі па асноўных этапах гістарычнага развіцця Беларусі. Перад музейнымі работнікамі выступіў начальнік аддзела навуковага выкарыстання інфармацыі Архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР Я. Шорахаў. Ён гаварыў пра выкарыстанне архіўных багаццяў, пра методыку работы ў архівах, пра сувязь музеяў і архіваў рэспублікі.

Лекцыі «Рысы ленінскага стылю работы» і аб міжнародным становішчы прачыталі кандыдаты гістарычных навук Г. Якуб і М. Карыпанаў. Дырэктар Дзяржаўнага музея БССР С. Сапешка зрабіў даклад аб рабоце музеяў на грамадскіх асновах. Вопытам рэстаўрацыі і кансервацыі музейных рэчаў падзяліўся рэстаўратар Дзяржаўнага музея БССР У. Маслыка. Выступілі таксама навуковыя супрацоўнікі Дзяржаўнага музея Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі (Ленінград) Н. Баранава, Дзяржаўнага гістарычнага музея (Масква) А. Шор, Маскоўскага навукова-даследчага інстытута музеязнаўства А. Закс, Д. Тварская, У. Палякова.

Удзельнікі семінара пазнаёміліся з экспазіцыямі і фондамі Дзяржаўнага музея БССР і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, зрабілі экскурсіі па Мінску і на трактарны завод, у вёску Хатынь і на радзіму Янкі Купалы ў Вязынку, у літаратурны музей Якуба Коласа і народны музей трактарнага завода.

Учора, у апошні дзень работы, на семінары выступіў намеснік міністра культуры БССР Р. Мачулін.

ПАЎГАДАВЫ ПЛАН ВЫКАНАНЫ

Рыхтуючы дастойную сустрэчу 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі, дзяржаўная кнігагандлёвая сетка рэспублікі паўгадавы план продажу кніг выканала на 109,2 працэнта. Магазіны і бібкалектары рэспублікі за шэсць месяцаў рэалізавалі рознай літаратуры на 5.210 тыс. рублёў. Аблкнігагандлі прадалі кніг у розніцу больш чым на 3.750 тыс. рублёў. За гэты ж час бібкалектары папоўнілі кніжныя фонды бібліятэк рэспублікі на 864 тысячы рублёў.

У юбілейным годзе значна палепшылі сваю работу абласныя кнігагандлі. Першае месца па выкананні плана шасці месяцаў заняў Брэсцкі аблкнігагандаль (дырэктар А. Кірылін), другое—Віцебскі (дырэктар М. Спаткай), трэцяе — Мінскі (дырэктар А. Дашкевіч).

Сярод бібліятэчных калектываў першае месца заваяваў Гомельскі бібкалектар (дырэктар Л. Балашова), другое — Брэсцкі (в. а. дырэктара І. Нядзведская) і трэцяе — Магілёўскі (дырэктар В. Чайкоўскі).

ВУЛІЦА ІНФАРМУЕ...

К. ТАРАСАЎ

НЕПРЫЕМНА гаварыць, але што зробіш — у добраўпарадкаванні сваіх гарадоў мы пакуль што адстаём ад прыбалтыйскіх рэспублік, Грузіі, Азербайджана, Ленінграда.

Мы пачалі ўводзіць у інтэр'ер і экстэр'ер дэкаратыўны метал — але пасля таго, як яго вярнулі з забыцця ў Грузіі і Літве. Замяняем асфальт на тратуарах бетоннай пліткай — але зноў пасля таго, як літоўцы наогул адмовіліся ад яго выкарыстання. Сённяшнія вулічныя кіёскі лепей за тыя, што былі тры-чатыры гады назад,—але ж яны не арыгінальныя, такія ж, як і ў другіх гарадах краіны (амаль усё прывозіцца ў Беларусь здалёк і, зразумела, не заўсёды ўпісваецца ў інтэр'ер вуліц нашых гарадоў арганічна). Мы толькі пачынаем падсвечваць увечары будынкі, зеляніну, фантаны — у Маскве ж і Рызе набыты ўжо шматгадовы вопыт у гэтай галіне. Аб дэкаратыўнай і функцыянальнай скульптуры мы толькі пачынаем гаварыць, а ў парках Прыбалтыкі і Ленінграда яна—рэальнасць.

Спіс таго, чаго ў нас няма, можна павялічыць. Але і тое, што ў нас ёсць, патрабуе да сябе ўвагі, удумлівага скарыстання. Якраз пра гэта і хочацца пагаварыць на прыкладзе Мінска.

Год назад на Ленінскім праспекце было «асучаснена» вулічнае асвятленне: на слупах замест старых шаравых ліхтароў з'явіліся гнутыя трубы новых свяцільнікаў. Асвятленне праспекта палепшылася, але знешні выгляд яго змяніўся і, на маю думку, у нечым прайграў. Адчуваюць гэта і самі ініцыятары мадэрнізацыі свяцільнікаў. Але я прыгадаў гісторыю са свяцільнікамі амаль гадавой даўнасці не дзеля таго, каб папракнуць каго-небудзь, — проста яна найбольш ярка падкрэслівае розніцу паміж тым, «як ёсць», і тым, «як павінна быць».

Архітэктура сама па сабе не можа стварыць завершаны вобраз вуліцы і нават усяго горада. Яна патрабуе пэўных дадаткаў, якія ўзмацняюць вартасці і кампенсуюць недахопы архітэктуры. Гэта—розныя кіёскі, ліхтары, сродкі візуальнай інфармацыі, зялёнае ўбранне горада, агароджы, лаўкі, урны і інш. Натуральна, яны павінны мець адпаведныя сучасным уяўленням дэкаратыўныя якасці, арганічна ўваходзіць у гарадскі ансамбль, а самае галоўнае—быць зручнымі для тых тысяч людзей, якія імі карыстаюцца.

Недахопы добраўпарадкавання вуліц асабліва кідаюцца ў вочы з боку інфармацыйнага прызначэння вулічнага інтэр'ера. На галоўных вуліцах Мінска многа магазінаў, кафэ, розных устаноў. Тут і ўдзень і ўвечары вялікі рух. Тут госці нашага горада ўпершыню знаёмяцца са «статутам» мінскага жыцця, сюды звернута асаблівая ўвага арганізацый, якія займаюцца добраўпарадкаваннем. Здавалася б, кожны элемент інфармацыйнага апарату (які, зразумела, не бездапосны да знешняга выгляду вуліцы) павінен быць аптымальна прадуманы. Але...

З кожнай сотні шыльдаў па меншай меры дзевяноста размешчаны па фронту будынкаў на вышыні шасці-васьмі метраў ад тратуара. Прачытаць іх можна, толькі спыніўшыся на другім баку вуліцы. А паспрабуй разбярыся на шэрым або жоўтым фоне сцяны ў адмысловым перапляценні неонавых трубак удзень, калі шыльда не запалена. І натоўпы людзей арыентуюцца часцей з дапамогай дасведчаных прахожых. Увечары ж, калі большасць магазінаў, атэлье і кас зачынены, неонавыя шыльды гараць зазыўна. Але каго яны зазываюць і навошта?

Цесны рад белых люмінесцэнтных трубак не пакінуў месца для шрыфтавой каляровай вывескі, для эмблем з металу і дрэва. Амаль няма шыльд, пастаўленых упоперак патоку людзей, а яны былі б вельмі зручнымі, прыцягвалі б да сябе максімум увагі, іх можна было б чытаць і зблізку і здалёк.

Шэсць месяцаў у год строй дрэў не дазваляе ўбачыць, якія магазіны, кіно, сталовыя знаходзяцца на другім баку вуліцы. Карэнны жыхар, зразумела, ведае гэта і без шыльды, прыязджаму ж трэба траціць час на роспыты. Напэўна мела б сэнс дубліраваць шыльды магазінаў, кафэ, сталовых, білетных кас і да т. п. на ўзроўні апошняга паверху.

З мноства вулічных кіёскаў — кніжных, газетных, тэлефонных, сувенірных, кандытарскіх, садавіны і гародніны — толькі тэлефонныя маюць нейкую прыкметную уніформу. Аб прызначэнні астатніх скласці ўяўленне, калі глядзіш здалёк, вельмі цяжка. Чалавеку захацелася марожанага — і ён спяшаецца да бліжэйшага кіёска, памятаючы, што ў такім самым ён купляў марожанае ўчора. Але аказваецца, што замест марожанага тут прадаюць лімоны.

Яшчэ цяжэй знайсці прыпынкі аўтобуса альбо тралейбуса. З-за лісця дрэў знак, прымацаваны на слупе, амаль не бачны. І нічым больш прыпынак не абазначаецца. Арыентавацца даводзіцца па натоўпах людзей, якія чакаюць транспарту. (Я не кажу ўжо аб лаўках, на якіх можна было б не толькі пасядзець, чакаючы транспарт, але якія пэўнай формай або расфарбоўкай маглі б нагадваць пра прыпынак).

А вазьміце вячэрні ўбор горада. Ён багацейшы, чым дзённы. І гэта зразумела. Агні машын, ліхтары, асветленыя вокны, вітрыны, светлавая рэклама — досыць цікавы ансамбль. У ім — дзве часткі: нязменная і тая, якая арганізуецца. Асвятленне кватэр, агні машын і вулічныя свяцільнікі даводзіцца прымаць такімі, якія яны ёсць — ліхтары мяняюцца раз у дзесяць гадоў, чырвоны колер «стоп-сігналу» прадугледжаны дзяржаўным стандартам, а ў кватэрах усё залежыць ад густу гаспадара. Але светлавая рэклама, вітрыны і да т. п. палкам належаць афарміцелям. Я ўжо казаў, што да поўначы спецяцца шыльды магазінаў. Рознакаляровая лінія іх — самая прыцягальная сярод усіх вулічных агнёў. А вітрыны асветлены сумным святлом люмінесцэнтных лямп або наогул зацёмнены. І вось—характарная дэталь: ля магазіна пад шыльдай «Абутак» людзі, прыціснуўшыся да шкла, спрабуюць разгледзець, што там на стэндах.

Яркая гарызантальная шыльда нязручная і з дэкаратыўнага боку. Фасады дамоў нагадваюць корпус карабля, на якім ватэрлінія — паласа неонавых трубак. Вертыкальны светлавы дэкор маюць толькі некаторыя будынкі. Дарэчы, дэкорам яго можна назваць умоўна, бо гэта проста шыльды, толькі напісаныя зверху ўніз.

За апошнія гады ў Мінску з'явілася шмат светлавой рэкламы. І калі на хвлінку пакінуць размову аб эстэтычных якасцях гэтай рэкламы і паглядзець, што ж яна рэкламуе, то перад намі будзе карціна, па меншай меры эдзіўляючая. Вось прыклад тыповай мінскай рэкламы: «Пры пажары званіце па тэлефоне — 01!» Карыстаючыся гэтым узорам, увесь горад можна запоўніць аналагічнымі заклікамі: «Пры аграбленні званіце — 02!», «Паламалі нагу — набірайце 03!» А чаму б і не?.. Заклікаем жа мы: «Захоўвайце грошы ў ашчаднай касе!». Усе гэтыя заклікі не што іншае, як вынік бяздумнай вернасці старыне, таму часу, калі ў пажарных дэпо толькі з'явіліся тэлефоны, а да ашчадных кас яшчэ толькі прыглядваліся і захоўвалі грошы пераважна ў жончынай панчосе. Але час ідзе. Пераконваць людзей у тым, у чым яны і так перакананыя, — проста неразумна.

Кожная змена павінна нешта ўдасканальваць, а не быць самамэтай. Аб гэтым вельмі часта забываюцца, пачынаючы рэканструкцыю таго або іншага будынка, інтэр'ера, дэталі афармлення вуліцы і г. д. Да нядаўняга рамонту ў магазіне падпісных выданняў былі антрэсолі з кніжнымі паліцамі. Пры рамонце антрэсолі разбурылі, замянілі цёмнае дрэва светлым, прастору па вертыкалі падзялілі сеткаю з драўляных рэек — і магазін страціў сваё аблічча. Такая ж гісторыя атрымалася і з магазінам «Тытунь». Па традыцыі ў тытунёвых магазінах прыглушанае асвятленне, цёплыя тоны роспісу. Так выглядаў і магазін «Тытунь» у Мінску да рамонту. Хто зразумее, чым кіраваліся рэканструктары, ператварыўшы яго ў нешта падобнае на «офіс» у лонданскім прыгарадзе. Можа, хацелі зменшыць колькасць курыльшчыкаў ці стараліся стварыць сіметрыю і «асіміляваць» тытунёвы магазін з магазінам «Абутак» на другім баку вуліцы?..

Зараз у нас пачынаюць весці гаворку аб стылізаваных «пад старажытнасць» кафэ і рэстаранах. Напэўна, неўзабаве нешта такое з'явіцца дзе-небудзь на першым паверсе сучаснага будынка. Чаму сучаснага? Ды таму, што старыя будынкі мы разбураем або прыводзім да нейкага агульна-сучаснага стандарту.

Аналагічныя недарэчнасці і з архітэктурным дэкорам. Нядаўна была знішчана наваная агароджа, якая паўстагоддзя ахоўвала маленькія газоны ля дома № 12 па вуліцы Карла Маркса. Больш за ўсё здзіўляе тое, што зроблена гэта не без згоды Дзяржаўнага музея БССР.

Мне могуць сказаць, што я адхіліўся ад тэмы. Не, не адхіліўся. Бо вуліцы павінны «інфармаваць» і аб тым, што такі горад, як Мінск, з'явіўся не сёння, не сто гадоў назад, што ў яго за плячыма стагоддзі і стагоддзі...

Хто ведае, можа, праз некаторы час мы па фатаграфіях станем аднаўляць тое, што было разбурана яшчэ за нашай памяццю,—дакладна так, як зараз мы складваем падмурак царквы старажытнага Замчышча, не захаваны ў часе раскопак....

Мы не займаемся добраўпарадкаваннем горада рупліва і штодзённа. Кожны, у каго ёсць грошы на рэкламу, скарыстоўвае іх так, як яму прыйдзе ў галаву. Ну, а калі ў галаву нічога не прыходзіць? Тады з'яўляюцца шыльды, магазіны, кіёскі, падобныя, як блізняты.

У нас няма генеральных планаў афармлення гарадоў, якія прадугледжвалі б добраўпарадкаванне і ўпрыгожванне для старых і новых раёнаў, улічвалі б профіль і характар вуліц, праводзілі б каардынацыю афарміцельскіх работ. Планаў няма. Адкуль ім быць, калі ў нас няма прафесіяналаў, якія займаліся б афармленнем гарадоў.

Калі мы хочам, каб нашы гарады былі сапраўды прыгожымі, то справу добраўпарадкавання не павінны пускаць на самацёк.

ВАМ, ЮНЫЯ!

Пяць год назад пры абласным драматычным тэатры для абслугоўвання юнага гледача была створана група лялечнікаў, якую ўзначаліў Віктар Чарняеў. За гэты час энтузіясты-лялечнікі паставілі дзесяць спектакляў.

І вось сёння ў Гомелі ёсць свой стацыянарны абласны тэатр лялек. Маладому калектыву вызначана ўжо памяшканне — будынак былога кінатэатра «Зорка», у якім пачалася рэканструкцыя сцэны і глядзельнай залы.

Калектыў тэатра—маладзёжны. Акцёры ў пераважнай большасці былыя ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці: Л. Шаўкунова, М. Заматаеў, У. Матрос, Л. Гамзюк, Т. Гарачава, Л. Чэкалінская і іншыя.

— Жывём пакуль што на калёсах,—гаворыць галоўны рэжысёр, ён жа дырэктар тэатра Віктар Чарняеў.—За час летніх канікул мы імкнёмся абслужыць як мага больш вясковых дзяцей. Тэатр пабываў ужо ў Чачэрскім, Веткаўскім і Нараўлянскім раёнах. І ўсюды нас сустракаюць як добрых, жаданых гасцей.

У рэпертуары тэатра спектакль па п'есе дагестанскага драматурга Абакарава «Залатыя рукі». Гэта—казка пра хлопчыка, які шукае зачараваны бубен, каб вызваліць свой народ з няволі.

А нядаўна прэм'ера спектакля па п'есе Ю. Елісеева «Неразменны рубель». Дасціпны, вясёлы спектакль узнімае тэму любві да працы. Тэкст п'есы вершаваны, і дзеці надзвычай жыва рэагуюць на падзеі, што адбываюцца на сцэне.

У бліжэйшы час тэатр пачынае працаваць над новымі спектаклямі для юных гледачоў: «Іван, сялянскі сын» В. Сударушкіна, «Снягурчына школа» Г. Ландау. Будзе таксама рыхтавацца спектакль для дарослых «Боская камедыя» І. Штока.

УСМІХНІЦЕСЯ З ПАВАГАЙ

Мастак С. Каткоў знаёміць школьнікаў з экспанатамі выстаўкі.

Фота Ул. КРУКА.

ДЗЕЦІ—народ сур'ёзны. Гэтую ісціну яшчэ раз даказвае 21-я рэспубліканская выстаўка дзіцячага выяўленчага мастацтва, якая адкрылася 10 ліпеня ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР. Больш чым 1800 работ юных мастакоў рэспублікі закранаюць самыя важныя бакі нашага жыцця. Выстаўку ўмоўна можна падзяліць на чатыры вялікія тэматычныя аддзелы: «Мір, сонца, мама і я», «Рэвалюцыя і грамадзянская вайна», «Героіка Айчыннай вайны», «Космас». Работы дзяцей дэманструюць не толькі віртуознае валоданне каляровымі алоўкамі, іх любімай тэхнікай, але і добрае веданне складаных графічных прыёмаў: акварэлі, гуашы, тэмперы, гравюры і нават энкаустыкі.

Кампетэнтнае журы з прадстаўнікоў Саюза мастакоў Беларусі, работнікаў ЦК ЛКСМБ, Міністэрства асветы БССР прад'яўляла да твораў юных сур'ёзныя патрабаванні. Работы павінны былі быць актуальнымі па тэме, глыбокімі па зместу і, зразумела, мастацкімі. І ўсе ўдзельнікі, ад трохгадовай Марыйкі Гаркуновай да «масцітага» дзевяцікласніка-брэстаўчаніна Ігара Марчанкі, добра справіліся са сваёй задачай.

— Як пісаць для дзяцей?—спыталі аднойчы ў Максіма Горкага.

— Гэтак сама, як для дарослых, толькі яшчэ лепш.

Калі хто-небудзь спытае, як ставіцца да дзіцячага малюнка, яму можна адказаць:

— Гэтак сама, як да работ прафесіянальных мастакоў, толькі яшчэ сур'ёзней. А калі тое, што вы ўбачыце, выкліча ўсмешку, значыць вы зразумелі галоўнае і самае цікавае, што вылучае дзіцячыя малюнкі—непасрэднасць успрыняцця свету.

С. ПЕТЭРСОН.

ШЧАСЛІВАЙ ДАРОГІ, НАРОДНЫ!

За дасягнутыя поспехі ў развіцці драматычнага мастацтва і высокае выканаўчае майстэрства калегія Міністэрства культуры БССР прысвоіла ганаровае званне «Народны» самадзейнаму тэатру юнага гледача Бялыніцкага раённага Дома культуры.

БІЯГРАФІЯ гэтага калектыву яшчэ невялікая.

Спачатку пры раённым Доме культуры працаваў драматычны гурток. У яго ўваходзілі маладыя рабочыя і служачыя райцэнтра, Паралельна пры раённым Доме піянераў дзейнічаў драматычны гурток старшакласнікаў. Гурткі ставілі невялікія сцэнкі, скетчы, інтэрмедыі, п'есы-адноактоўкі.

У 1965 годзе абодва калектывы аб'ядналіся ў адзін самадзейны тэатр юнага гледача раённага Дома культуры. У хуткім часе стала тут працаваць і тэатральная студыя.

Першай пастаноўкай, якая прынесла поспех самадзейнаму ТЮГу, быў спектакль па п'есе Л. Малюгіна «Дзяўчынкі-хлопчыкі». Яго паказвалі не толькі ў сваім і суседніх раёнах, але і ў Магілёве, дзе ён быў адзначаны дыпломам. Спектакль адабралі для паказу ў Мінску на фестывалі самадзейнага мастацтва, прысвечаным 50-годдзю Вялікага Кастрычніка. Высокую ацэнку далі сталічныя гледачы не толькі гэтаму спектаклю, але і другому — «Яны і мы» па п'есе Н. Далінінай, які таксама быў паказаны летась у Мінску.

Не так даўно тэатр юнага гледача (рэжысёр Г. Алянсеюс) паказаў сваю новую пастаноўку па п'есе «Спатканне ля чаромхі» А. Ларава. Спектакль атрымаўся яркі. Зараз калектыў працуе над п'есай А. Махнача «Шпачок». Гэтую работу ён прысвячае 50-годдзю БССР і 50-годдзю ВЛКСМ.

За час сваёй дзейнасці ТЮГ даў у Бялыніцкім, Кіраўскім, Шклоўскім, Магілёўскім раёнах і ў Магілёве больш 30 спектакляў, абслужыў звыш чатырох тысяч юных гледачоў.

Калектыў тэатра па свайму складу невялікі, ўсяго 28 чалавек. Але аб'ядналіся ў ім людзі таленавітыя, сапраўдныя энтузіясты: касір райсабеса Н. Дзямідава, выкладчыкі Д. Дубар, І. Лахей, В. Чарноў, электрык пагельні А. Карчма і іншыя. Нядаўна ў калектыў і ў тэатральную студыю прыйшло новае здольнае папаўненне — В. Давыдава, В. Кучрачэнка, С. Маразевіч, Т. Нікалайчанка, Л. Карчма, І. Ганакова.

МІХАЛ ТВАРЫЦКІ І ІНШЫЯ

Ілюстрацыі да рамана К. Чорнага «Трэцяе пакаленне» — дыпломная работа выпускніка Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута В. Сакалова.

МАЗЫР — ГОРАД ТЭАТРАЛЬНЫ

ПРА НАРОДНЫ тэатр Мазырскага гарадскога Дома культуры гаварылі і пісалі не раз. Аднак упершыню па-сапраўднаму, на ўвесь голас загаварылі пра гэты калектыў летась. Ён тады, для многіх нечакана, і стаў лаўрэатам юбілейнага Усесаюзнага агляду драматычных калектываў мастацкай самадзейнасці. Спектакль мазыран па драме Янкі Купалы «Раскіданае гняздо» з поспехам прайшоў у Крамлёўскім тэатры ў Маскве.

Гэта — невыпадковая ўдача. Гэта правамерны, з цяжкасцю народжаны поспех. Каб лепш зразумець, як ён прыйшоў, варта аглянуцца назад. Мусіць, у станаўленні і развіцці гэтага калектыву нямала агульнага з іншымі народнымі тэатрамі рэспублікі. А можа знойдзецца што павучальнае і для тых калектываў, якія зараз змагаюцца за права і гонар называцца народнымі.

МАЗЫР нельга ўявіць без спакойнай Прыпяці, без шумлівага зялёнага мора дрэў, у якім тонуць вуліцы, дамы, без маляўнічых узгорнаў, на якіх прывольна раскінуўся горад. Гэтак жа нельга ўявіць Мазыр без самадзейнага мастацтва яго жыхароў. Тут чатыры вялікія клубы. І ў любую пару года ў іх музыка, песні, танцы. Ідуць рэпетыцыі, пульсуе культурнае жыццё.

Гарадскі дом культуры. Тут працуюць харавы і танцавальны калектывы, аркестр народных інструментаў, духавы і эстрадны аркестры, ансамбль пенсіянераў, студыя выяўленчага мастацтва. Сталае месца сярод іх заняў і драматычны гурток.

У драмгуртку здаўна склалася сваё ядро з энтузіястаў, людзей, што поўнасцю аддаюць свой вольны час любімаму мастацтву.

Веру Іванаўну Казлоўскую ведаюць у Мазыры даўно як выдатнага педагога і выхавацеля. Але яна — і старэйшая, вопытнейшая ўдзельніца драмгуртка. Не сказаць, каб жыццё яе песціла. Застаўшыся ў вайну без мужа і дзяцей, Вера Іванаўна ўсю сваю любоў, ласку і клопаты перанесла на выхаванцаў Мазырскага дашкольнага дзіцячага дома. Праца не лёгкая, а тут яшчэ і здароўе крыху падводзіць. Але прыпамінай — не прыпамінай, не ўспомніш, каб Вера Іванаўна хоць раз спазнілася ці, крый божа, зусім не прыйшла на рэпетыцыю.

— Не магу без сцэны ўявіць сваё жыццё, — гаворыць Вера Іванаўна. — Як пабудзеш на рэпетыцыі, дык, здаецца, паздаравеець і памаладзееш.

Не, трэба абавязкова бачыць, як працуе яна над кожным новым вобразам, каб зразумець, што значыць для чалавека любімы занятак...

Многа розных турбот і ва Уладзіміра Рудзінскага. Самі мяркуйце — чалавек працуе ў міліцыі. А спытайцеся ў яго, колькі гадоў ён аддаў самадзейнай сцэне, і Уладзімір Аляксандравіч, неяк сарамліва ўсміхнуўшыся, адкажа, што ў гуртку ён з самага дзяцінства. А гэта больш за дваццаць.

Сапраўдная душа калектыву, яго нязгасны агеньчык — Андрэй Іванавіч Лазарэўскі. І ў яго змалку прырасла да сцэны душа. Здольны выканаўца, чалавек багатага жыццёвага вопыту, вялікага сэрца ён шчодра дзеліцца з моладдзю душэўнымі набыткамі. Вельмі любіць, разумее і цэніць Андрэй Іванавіч гумар, дасціпны жарт. Таму і цягнуцца ў калектыве да яго людзі.

Незвычайны жыццялюб і няўрымслівы чалавек Пётр Сяргеевіч Захараў. Па прафесіі ён мастак. Не адзін узыход сонца і росны ранак сустраў ён з эцюднікам у руках дзе-небудзь у жытнёвым полі ці лузе, або на беразе рахманай Прыпяці. Здаецца, нават на рэпетыцыі ён прыносіць водар палёў, іх чысціню і свежасць. І вобразы яго, якія ён стварае ў самадзейных спектаклях, — натуры лірычныя, узнёслыя, эмацыянальна насычаныя.

Многа цёплых слоў можна сказаць пра Марыю Анікееву, Аляксея Лаўнюкевіча, Лізавету Трутанаву і іншых людзей, улюбёных у тэатр, адданых яму.

Кожны з іх сыграў не адзін дзесятак роляў, не адна сотня кіламетраў адмерана кожным па каляіністых дарогах Палесся, не адна тысяча ўдзячных гледачоў апладзіравала драмгуртКоўцам у гарадах, пасёлках і вёсках. І гледачы разам з самадзейнымі артыстамі шчыра радаваліся, калі ў канцы 1959 года калегія Міністэрства культуры БССР прысвоіла драмгуртку званне «Народнага тэатра».

Прыняўшы віншаванні, гурткоўцы задумаліся: званне прысвоена, а што далей? Як узняцца на новую ступень? Трэба многа, пераасэнсаваць, выбраць пэўны кірунак, а галоўнае — няспынна ўдасканальваць творчае майстэрства.

ЗНОВАЙ прэм'ерай рашылі не спяшацца. Трэба было зрабіць спектакль, які адпавядаў бы высокаму званню прысвоенаму калектыву, — глыбокі, творча спелы.

К таму часу ўдалося знайсці неблагога рэжысёра. Аляксей Дзмітравіч Селіванаў меў немалы вопыт работы ў самадзейнасці, хоць сам быў рэжысёрам-прафесіяналам.

Ён пачаў з асновы асноў — з вывучэння артыстамі «Этыкі» К. Станіслаўскага. Тэарэтычная і практычная падрыхтоўка ўдзельнікаў тэатра была надзвычай слабая, правільней — яе зусім не было. А хіба можна без яе весці гаворку аб творчым росце, аб паглыбленні майстэрства? Аляксей Дзмітравіч вучыў творчай дысцыпліне, даваў эцюды, праводзіў трэнажы, займаўся пастаноўкай голасу і дыхання. Людзі вучыліся ўдумлівай рабоце над кожнай роллю, над спектаклем у цэлым.

Вядома, нельга механічна на самадзейную сцэну пераносіць усе каноны сцэны прафесійнай. Гэта магло б прывесці, ды часта ў іншых тэатрах і прыводзіла, да штампаў і штучнасці. А. Селіванаў вучыў акцёраў вельмі тактоўна і асцярожна.

К гэтаму часу гарадскому Дому культуры перадалі памяшканне былога гарадскога тэатра. Лягчэй зажылося і народнаму тэатру. Выпушчаны ў 1960 годзе спектакль па п'есе А. Арбузава «Далёкая дарога» (дарэчы, ён быў падрыхтаваны ў два саставы — гэта ў гуртку ўпершыню) сведчыў аб значным кроку наперад, аб настойлівых пошуках калектыву. Спектакль быў цікава вырашаны па-рэжысёрску. Узрасло і выканаўчае майстэрства артыстаў. Усё тое, чаму вучыў, чаго патрабаваў рэжысёр, не прапала даремна. Спектакль усюды праходзіў з поспехам. Гэта акрыліла. Калектыў народнага пасталеў і творча падужэў.

І хоць тэатр потым доўга заставаўся без рэжысёра, тое лепшае, што з'явілася ў калектыве, паспела ўжо глыбока пусціць карэнні, даць добрыя парасткі. І рэпетыцыі працягваліся, рыхтаваліся новыя спектаклі: «Юнацтва бацькоў», «Блудны сын», «Без віны вінаватыя», «Лявоніха на арбіце». Натуральна, не ўсе яны былі аднолькава спелымі. Але гледачы верылі ў свой тэатр, у яго жыццядзейнасць, верылі, што цяжкі перыяд мінецца.

Урэшце ў Мазыры прыгледзеліся да здольнага выканаўцы, чалавека, які добра ведаў, глыбока любіў самадзейную сцэну, збіраўся прысвяціць ёй сваё жыццё — да Міхаіла Коласа. Гэта быў рэжысёр ад прыроды, рэжысёр-самародак. Яму ў 1966 годзе і даверылі тэатр. З яго прыходам Народны тэатр як бы набыў другое дыханне.

ПАРАЎНАЎЧА за кароткі час выкрышталізавалася не толькі арганізацыйная і творчая структура калектыву (пачаў рэгулярна працаваць мастацкі савет, з'явіліся асістэнты і памочнікі рэжысёра, стараста калектыву). Тэатр паступова, і гэта галоўнае, пачаў набываць сваё аблічча. Быў узяты кірунак пераважна на творы беларускіх аўтараў. У рэпертуары сталае месца занялі спектаклі «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка і «Канчане — суседзі мае» І. Козела. Сапраўды творчую загартоўку атрымаў калектыў у час работы над спектаклем Я. Купалы «Раскіданае гняздо».

У тэатр прыйшлі здольныя юнакі і дзяўчаты — Яўген Дашкевіч, Галіна Клімовіч, Зіна Нагорная, Яўген Дзідзенка, Кацярына Прыдыбайла, Сямён Вайнштэйн і іншыя. Ім перадаюць свае веды старэйшыя. Не спыняецца творчая вучоба. Яна добра спланавана, стала сістэматычнай. Творчыя заняткі часта праводзяць метадысты абласнога Дома народнай творчасці, вядучыя акцёры, рэжысёры абласнога драматычнага тэатра. Артысты народнага глядзяць гастрольныя спектаклі, абмяркоўваюць іх. Усё гэта шмат дае ўдзельнікам народнага тэатра, павышае іх культурны і прафесіянальны ўзровень.

Другі год пры Мазырскім народным тэатры паспяхова працуе маладзёжная група. Летась яна паказала юным гледачам спектакль «Два клёны», а сёлета рыхтуе спектакль «Зайка-зазнайка».

Да 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі тэатр рыхтуе спектакль па п'есе К. Крапівы «Партызаны». У ім заняты амаль увесь творчы састаў. Адначасова кожную суботу і нядзелю калектыў выязджае са спектаклямі. Тэатр — часты і жаданы госць калгаснікаў і рабочых саўгасаў не толькі Мазыршчыны, але і Нараўлянскага, Ельскага, Лельчыцкага, Петрыкаўскага, Калінкавіцкага і Светлагорскага раёнаў.

У КНІЗЕ ВОДГУКАЎ тэатра працаўнікі калгаса імя Чапаева Калінкавіцкага раёна пасля прагляду спектакля мазыран «Канчане — суседзі мае» напісалі: «Шчыра ўдзячны за радасць сустрэчы з вамі, за цудоўныя хвіліны хвалявання і душэўнай узрушанасці, якія вы далі нам сваім спектаклем».

Такіх запісаў многа. Невыпадкова Міністэрства культуры БССР узнагародзіла калектыў тэатра Ганаровай граматай за поспехі ў культурным абслугоўванні працаўнікоў сяла.

Вялікія планы на будучае ў калектыва тэатра і яго рэжысёра. Вялікая дарога ў свет цудоўнага перад Мазырскім народным, і многа радасцей чакае мазыран на гэтай дарозе.

І. ТАРАСЮК.

ЦУД, ДА ЯКОГА ПРЫВЫКНУЦЬ НЕМАГЧЫМА

ЦУДЫ наступаюць на нас, людзей другой палавіны дваццатага стагоддзя, з усіх бакоў. Мы прывыклі да штучных спадарожнікаў Зямлі і касмічных караблёў, да здымкаў Месяца і найдрабнейшых часцінак матэрыі, да складанейшых электронных машын і да шмат чаго іншага. Але ёсць цуд, да якога прывыкнуць немагчыма, цуд, які не перастае здзіўляць. Гэта — цуд нараджэння прыгажосці, цуд пазнавання непаўторнасці свету, яго маляўнічасці...

Свеціць сонца, зелянее першая трава і першая веснавая лістота, вясёлыя людзі будуюць прыгожыя дамы, на святочных вуліцах горада чырванеюць сцягі... Быццам нейкі добры чараўнік адкрыў дзесяткі, сотні акон у навакольны свет. Такое ўражанне было ў фае Дома афіцэраў у час выстаўкі малюнкаў юных выхаванцаў студыі выяўленчага мастацтва Палаца культуры Мінскага камвольнага камбіната.

Творы на гэтай выстаўцы актыўна сцвярджалі, што дабро абавязкова мацней за зло, што добрыя, разумныя дарослыя людзі ніколі і нікому не дазволяць пакрыўдзіць дзяцей...

Юныя мастакі пільна прыглядаюцца да самых разнастайных праяў жыцця. «На новай кватэры» — у гэтай рабоце адзінаццацігадовая Таня Парасяцьева самімі колерамі падкрэслівае святочнасць і значнасць сваіх уражанняў ад падзеі. «У гарах Югаславіі» дзесяцігадовага Вовы Ахрамовіча. Тут мы бачым блакітныя горы, заходзячае сонца, і на гэтым фоне плячом да пляча стаяць лётчык у шлеме і акулярах, партызан у папасе з чырвонай стужкай на ёй і хлапчук у піянерскай форме. Немагчыма стрымаць усмешку, калі бачыш размаляваныя твары, стракатае адзенне, надзвычай яркі фон у малюнку дванаццацігадовага Лёні Ажара «Анархісты»...

Вельмі разнастайныя спосабы малявання. Але ў той жа час ёсць і нешта агульнае ў работах выхаванцаў студыі, тое, чым адрозніваюцца яны ад работ юных мастакоў іншых студый горада. Мне здаецца, гэта — імкненне да дэкаратыўнасці, імкненне, хай сабе не заўсёды ўдалае, выказаць праз колер сутнасць прадмета або падзеі, што ўразіла юнага мастака.

Пабываўшы на выстаўцы, мне захацелася наведаць студыю. Там я пазнаёміўся з выхавацелем юных мастакоў — выпускніком Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута Васілём Сумаравым.

...На сценах і на падлозе светлага, з вялізнымі вокнамі пакоя студыі столькі дзіцячых малюнкаў, лінагравюр, аплікацый, што не ведаеш нават, на чым спачатку засяродзіць увагу.

— Мы цяпер прымаем удзел у дзвюх выстаўках, — тлумачыць В. Сумараў. — Адна з іх — рэспубліканская ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР. Другая — ў нямецкім горадзе Патсдаме.

В. Сумараў кіруе студыяй ужо тры гады. Заняткі наведвае каля 70 юных аматараў выяўленчай творчасці. Стварыўся пастаянны актыў студыі — чалавек дваццаць хлопчыкаў і дзяўчынак з суседніх з камвольным камбінатам школ. Некаторыя, нават пераехаўшы з бацькамі ў іншыя далёкія ад камвольнага камбіната раёны горада, працягваюць наведваць заняткі.

Кіраўнік дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва ў Палацы культуры Мінскага камвольнага камбіната Васіль Сумараў і выхаванец студыі Толя Цыханавец, які марыць паступіць у мастацкае вучылішча.

Мяне цікавіць, як кіраўнік студыі прывівае сваім вучням імкненне да пастаяннай, настойлівай работы.

— Дзеці бачаць свет маляўнічым. У іх багатае ўяўленне. Таму юныя мастакі надзвычай актыўна выяўляюць свой «пункт гледжання» на падзеі, падкрэсліваюць іх сутнасць, пагарджаюць другарадныя падрабязнасцямі. Іменна гэтыя здольнасці я і стараюся падтрымаць, прапануючы ім шмат маляваць на вольныя тэмы. Іншая справа — малюнкі на зададзеныя тэмы, калі, напрыклад, у нацюрморце даводзіцца перадаваць на паперы і аб'ёмнасць, і матэрыяльнасць прадметаў. Тут ужо юным мастакам часта нестае цярпення — яны хутка стамляюцца. Вось чаму я імкнуся ўвесь час разнастаіць і самі заданні, і тэхніку выканання. Мае выхаванцы працуюць і ў акварэлі, і ў гуашы, і ў лінагравюры, і ў энкаустыцы. Ствараюць і невялікія малюнкі, і шматфарбныя вялікія пано. Часта яны працуюць калектыўна над адным творам — па двое-трое. Мы задумалі нават стварыць вітражы ў вокнах нашага палаца...

Улетку студыйцы рэгулярна бываюць на эцюдах. Старэйшыя малююць, а самыя малыя проста гуляюць, назапашваюць уражанні. Паляць вогнішчы. Спяваюць. А на паперу ўражанні ад «вылазак на пленэр» трапляюць пазней — у студыі.

Глядзіш работы студыйцаў, і дзівішся багацтву індывідуальнасцей, якія так шчыра, так непасрэдна раскрываюцца ў часе заняткаў. Дванаццацігадовая Ліда Захарэвіч умее перадаваць у партрэтах не толькі падабенства, але і рысы характару сяброўак. Казачныя матывы ўдаюцца дзесяцігадовай Галі Бродзік.

А вось работы студыйцаў, прысвечаныя гераічнаму змаганню В'етнама. «Пераправа», «Лясная школа», «Партрэт в'етнамскага салдата», «Аруць на быках»... Студыйцы пераглядзелі шмат фатаграфій, фільмаў, а кіраўнік расказваў ім аб асаблівасцях в'етнамскага побыту, касцюмаў, пейзажаў, аб асаблівасцях в'етнамскага выяўленчага мастацтва.

Выхоўваецца ў студыйцаў і любоў да традыцый беларускага народнага мастацтва. Сведчанне гэтага — шматлікія арнаменты і роспісы, выкананыя з густам і любоўю.

Нядаўна студыйцы паглядзелі фільм і спектакль па купалавай «Паўлінцы». У малюнках на тэмы «Паўлінкі» асабліва ярка выявілася іх імкненне да перадачы нацыянальнага каларыту і ў персанажах, і ў касцюмах, і ў абстаноўцы. Цікава, што ў цэнтры ўвагі юных мастакоў апынуліся найбольш драматычныя моманты твора. Асабліва ўдала стварылі малюнкі на тэмы «Паўлінкі» Сярожа Расолька, Сярожа Клішэвіч і Юра Скарэнка.

Тома Позняк, Галя Бродзік, Коля Рой захапляюцца тэмай мірных і ваенных будняў Савецкай Арміі.

З самымі рознымі пытаннямі прыходзяць да свайго кіраўніка студыйцы. Іх цікавіць гісторыя нашай рэвалюцыі, партызанскае мінулае рэспублікі, інтэрнацыянальная еднасць народаў розных краін у барацьбе супраць імперыялістаў. І пасля гутарак з кіраўніком з'яўляюцца работы на хвалюючыя юных мастакоў тэмы.

Калі я знаёміўся з работай студыйцаў, дык і сам быццам глядзеў на свет дзесяткамі сур'ёзных і смяшлівых дзіцячых вачэй. І яшчэ трошкі — вачыма іх выхавацеля, уважлівымі і ўсхваляванымі прыгажосцю свету.

Няхай не ўсе са студыйцаў стануць мастакамі. Але цуд пазнавання непаўторнасці свету, яго прыгажосці — назаўсёды застанецца для іх цудам, да якога немагчыма прывыкнуць...

Яўген БЯЛЬКЕВІЧ.

БЕЛАРУСЬ ТУРЫСЦКАЯ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.]

гон-клуб, дзе можна было б паглядзець кіно, пачытаць, нарэшце, паспяваць, патанцаваць. На жаль, пакуль што справа не рухаецца...

Але настроены Барыс Фёдаравіч аптымістычна.

— Справа наша новая, — гаворыць ён, — яшчэ некалькі гадоў назад турызм у Беларусі быў, калі можна так сказаць, у зародкавым стане. Галоўнае — у нас добрыя перспектывы. У гэтай пяцігодцы намечана пабудаваць у рэспубліцы цэлы шэраг турбаз на 6,6 тысяч месц, што дасць магчымасць адначасова прымаць 10 тысяч турыстаў, а за сезон абслугоўваць каля 100 тысяч чалавек. У прыватнасці, вырастуць новыя турбазы ля Віцебска, Барысава, Оршы, Бабруйска, Полацка, Рэчыцы і іншых гарадоў.

Адным словам, ёсць усе магчымасці паставіць у нас турызм, як кажуць, на індустрыяльныя рэйкі.

З лічбаў росту пачаў сваю гаворку і кіраўнік беларускага аддзялення «Інтурыста» Анатоль Міхайлавіч Сямашка...

— Беларусь — рэдкі па прыгажосці край, — гаворыць ён, — і да нас з вялікай ахвотай едуць замежныя турысты. Летась, напрыклад, іх было 22 тысячы — больш чым з 30 краін. Сёлета гэтыя лічбы адпаведна складуць 24 і 40...

Да паслуг прыезджых каля 100 розных турысцкіх аб'ектаў у Мінску, Брэсце, Гродна і г. д.

Але хоць лічбы гэтыя «гучаць», скажу шчыра, задаволіць яны ўжо не могуць. У нас ёсць магчымасці ў многа разоў узмацніць прыток турыстаў з-за мяжы. Чэснае слова, варта праехаць некалькі тысяч міль, каб пабачыць нашы сінявокія азёры, нашы велічныя бары, Але... але справа за сервісам. Гэта — добрыя дарогі, матэлі, кэмпінгі, гасцініцы і г. д.

Многае ўжо робіцца. Я маю на ўвазе гасцініцы для турыстаў у Мінску і Брэсце. Толькі гэта дасць магчымасць адначасова прымаць дзве тысячы замежных гасцей, а не 400—500, як цяпер.

Я кажу Анатолю Міхайлавічу, што «Літаратура і мастацтва» неаднаразова ўзнімала пытанне аб вытворчасці сувеніраў у рэспубліцы. Мала ў нас добрых, па-мастацку зробленых сувеніраў. А гэта ж, відаць, таксама нейкая частка турысцкага сервісу, бо галоўны, калі можна так сказаць, спажывец сувеніраў, — той жа турыст...

— Я згодзен з вамі. Першае, што пачынаюць шукаць нашыя госці, — сувеніры. Я вам скажу, што ў многіх краінах, напрыклад, у Балгарыі ці Югаславіі вытворчасць сувеніраў — важная галіна прамысловасці. Прыбыткі ад продажу сувеніраў складаюць значную частку бюджэту.

А ў нас? Мне часта даводзіцца назіраць такі малюнак. Толькі што прыехаў аўтобус з турыстамі. З чамаданамі, сумкамі яны шумлівым натоўпам увальваюцца ў вестыбюль нашай сталічнай гасцініцы «Мінск» і адразу кідаюцца да кіёска, дзе прадаюцца сувеніры. Але многія вяртаюцца адтуль ні з чым.

Бедны, вельмі бедны ў нас выбар сувеніраў, якія нагадвалі б менавіта аб Беларусі, аб побыце яе народа, культуры, мастацтве.

Я ведаю, што вельмі многія турысты шукаюць беларускія нацыянальныя хустачкі, вышываныя кашулі, паясы, саматканыя дыванкі і г. д.

Вялікім попытам карыстаюцца мастацкія вырабы з дрэва, металу, зробленыя з густам цацкі і г. д. Ды паспрабуй знайсці ўсё гэта... Я размаўляў з тымі, хто адказвае за выраб сувеніраў. Яны здзіўляюцца, — маўляў, сувенірамі завалены дзесяткі кіёскаў у Мінску і іншых гарадах рэспублікі. Так, завалена. Але чым? Шырспажывам. А між тым у Беларусі ёсць нямала самабытных майстроў. Вось бы іх прыцягнуць да вытворчасці сувеніраў. Як, скажам, гэта робіцца ў Балгарыі ці Югаславіі. Там, што ні сувенір — то мастацкая рэч.

Калі яшчэ гаварыць пра абслугоўванне турыстаў, дык заўважу, што яны заўсёды вельмі, калі можна так сказаць, ласыя на памятныя мясціны, на помнікі архітэктуры, на старыну — адным словам на ўсё, што звязана з нацыянальнымі асаблівасцямі краіны, куды яны прыехалі.

Ведаеце, у Балгарыі, напрыклад, турысты ахвотна ездзяць глядзець нават старыя ветракі. А пра цэрквы, саборы і казаць няма чаго. Ці ўзяць нацыянальную кухню. Колькі ёсць аматараў пакаштаваць нашы стравы.

Мы, на жаль, на гэты бок сервісу пакуль што ўвагі амаль не звяртаем. Зрэшты, ледзь не забыўся. Вось першая ластаўка — недалёка ад Мінска, у Воўкавіцкім лесе мы пачынаем будаўніцтва беларускай карчмы. Яна будзе вытрымана ў нацыянальным стылі — маецца на ўвазе і архітэктура і ўнутранае аздабленне і, вядома, кухня.

...Карту Беларусі ўсё гусцей і гусцей пакрываюць турысцкія маршруты. Кожны, хто любіць родную зямлю, радуецца гэтаму. Бо больш турыстаў — значыць, больш сяброў.

М. ЗАМСКІ.

А КАЛІ З «БЮДЖЭТУ ІНІЦЫЯТЫВЫ»?..

ДА ПОЗНЯЙ ночы ў Целяханах ззяе асветленымі вокнамі... Я прадбачу, як чытач, прывучаны да такога пачатку, сам закончыць сказ: «...Дом культуры». Не, сябры, не Дом культуры — чайная. Хочаце зазірнуць сюды? Звычайны малюнак. Ля бочкі з півам завіхаецца цётка Машэ, ці Даша. Праз шызы тытунёвы дым ледзь разгледзіш людзей за столікамі. Звон посуду, шум галасоў...

Я напісаў гэта і спалохаўся, што целяханскае начальства яшчэ, барані божа, угледзіць у радках карэспандэнта намёк, што трэба скараціць гадзіны работы чайной.

Не, не, я не супраць, каб людзі пасля работы праводзілі свой вольны час у чайной. Праўда, хацелася б, каб тут было крыху і чысцей, і ўтульней, і культурней. Уяўляеце — Іван Іванавіч Іваноў апранае выхадны гарнітур і разам з жонкай і цешчай ідзе ў целяханскае кафэ, якое тут па старой звычцы называецца чайной. Яны займаюць чысценькі столік, садзяцца ў крэслы і за бутэлькай піва вядуць нетаропкую гаворку. Тым больш, што няма куды пайсці вечарам. Кіно? Я быў там на дзіцячым сеансе. Глядзеў «Сустрэчу на Эльбе». Добра, што знаёмая карціна, а то б нічога не зразумеў. Нельга было разабраць ні слова. Аказваецца, так тут дэманструюцца ўсе фільмы. Дрэнная акустыка, і таму дарослыя ў кіно амаль не ходзяць.

— Няўжо нельга нічога зрабіць? — пацікавіўся я ў дырэктара кінатэатра Мікалая Агур'янава.

— Э-э, няма чаго і казаць, — махнуў ён рукой. — Я ўсе вушы начальству пратрубіў, што і рамонт патрэбен, і апаратура ледзь дыхае... Дык ім што... Вось калі Целяханы былі раённым цэнтрам!..

Вось тут мы і падышлі да асноўнай тэмы нашай размовы.

Гэтае «Калі Целяханы былі раённым цэнтрам!» пасля давялося чуць ледзь не на кожным кроку. І выклікана яно не крыўдай на тое, што раней мы, маўляў, былі «ў цэнтры», а зараз — «правінцыя». Не, у аснове скаргаў даволі празаічныя рэчы. Мне расказвалі, што ў Целяханах — райцэнтры былі і стадыён, і дзіцячыя пляцоўкі, і чытальная зала пры бібліятэцы, і газетныя вітрыны, і кіёск «Саюздруку». Цяпер нічога гэтага няма. Нават на вядомым Вулькаўскім возеры — запусценне. Пляж брудны, ні лавак, ні якога-небудзь збудавання, дзе можна было б пераапрануцца. Нават апошняя выратавальная лодка і тая некуды знікла.

— Назаўтра ж, як мы не сталі райцэнтрам, нам разанулі бюджэт па ўсіх артыкулах, — скардзіцца старшыня гарпасялковага Савета Міхаіл Цвыркуноў, — і ніхто не спачувае...

Ну, што ж, яго можна зразумець. Сапраўды крыўдна, тым больш, што асаблівага спачування не дачакаешся. У гэтым мы ўпэўніліся крыху пасля, калі гутарылі ў Івацэвічах з дырэктарам раённага галаўнога кінатэатра Георгіем Бабінічам. Усе адказы на мае пытанні гэты вопытны ў гутарках з карэспандэнтамі таварыш даваў па адным шаблоне — маўляў, ён адзін, а аб'ектаў многа, усюды не паспееш.

Тут, відаць, дарэчы было б напісаць заключны абзац са зваротам да Івацэвіцкіх раённых арганізацый «павярнуцца тварам да культурных патрэб целяханцаў» і паставіць апошнюю кропку ў гэтай карэспандэнцыі.

Але кропку ставіць ранавата. Ёсць у мяне тое-сёе выказаць і целяханцам. Пачну з аднаго непрыемнага эпізоду. Я зайшоў на мясцовы паштамт. Памяшканне — нішто сабе. Адно здзівіла. Палавіна яго проста радавала вока — сцены і падлога акуратна падрамантаваны, чыста, утульна. У другой палавіне, там, дзе размешчаны тэлефонтэлеграф — столь і сцены скрозь у карычневых плямах.

Пытаюся, што гэта такое і чую доўгі расказ пра тое, як пяць гадоў назад, на целяханскім паштамце — тады раённым яшчэ — быў распачаты капітальны рамонт. Ён набліжаўся ўжо да завяршэння, як раптам Целяханы скасавалі, як райцэнтр.

— Як тады замазалі глінай шчыліны ў столі і сценах, так і засталося, — скардзіліся работнікі пошты. — На пабелку грошай не хапіла.

— Дык тут жа самім на дзве гадзіны работы, — не стрымаўся я. — Чым сядзець у гэтай брыдоце...

— А мы што — абавязаны? — пачулася ў адказ.

Сапраўды, у паштовых інструкцыях не напісана, што работнікі пошты павінны самі рамантаваць памяшканне. Але ж акрамя інструкцыі ёсць яшчэ нешта — грамадскае пачуццё, ініцыятыва.

Я разумею вас, Міхаіл Сцяпанавіч Цвыркуноў, што без сродкаў цяжка што-небудзь значнае «правярнуць». Але, чэснае слова, хіба патрэбен спецыяльны артыкул бюджэту, каб ачысціць ад смецця пляж і паставіць там лаўкі? Або паставіць газетную вітрыну, абсталяваць чытальную залу, зрабіць валейбольную пляцоўку і г. д.

У Целяханах я пазнаёміўся з цікавым чалавекам — Захарам Ошаравічам Зімаком. Ён дырэктар мясцовай школы-інтэрната. Мы з ім гутарылі не больш гадзіны, і за гэты час дзверы яго кабінета адчыніліся разоў пятнаццаць. Заходзілі з рознымі справамі не толькі настаўнікі, работнікі школы-інтэрната, але і людзі, якія разам з Захарам Ошаравічам не працуюць. Ён і мой прыход вытлумачыў па-свойму — думаў, што я прыйшоў на начлег. І не дзіва: у Целяханах няма гасцініцы, і ўсе камандзіровачныя ідуць да Зімака, які ўладкоўвае іх у пакоі для бацькоў, што прыязджаюць у школу-інтэрнат, а калі там няма месца, вядзе проста да сябе.

Мне расказвалі пра школу грамадскіх павук, якая на грамадскіх пачатках створана Захарам Ошаравічам. Яе наведвае пяцьдзесят пяць чалавек. У Зімака мара — на аснове гэтай школы арганізаваць універсітэт, дзе б целяханцы знаёміліся з асновамі грамадскіх, палітычных навук, музыкай, літаратурай, эстэтыкай...

...Вось цяпер можна паставіць кропку. Думаю, не трэба рабіць ніякіх разюме. І так ясна, што да чаго.

Р. РЭЛЕС.

Палемічна

ЁСЦЬ СВЯТЛО І Ў «АКНЕ»

Сяргей ГРАХОЎСКІ

Я НЕ ПАТРАБУЮ сведак, і не буду запрашаць у адвакаты ні акадэміка Паўлава, ні Пушкіна, ні Маршака, ні Цвятаевай. Прыйдзецца толькі часам спасылацца на тыя вершы і радкі Петруся Макаля, якіх не заўважыў крытык Р. Бярозкін. У артыкуле («Літаратура і мастацтва» № 42) ён вынес у загаловак пытанне «Майстэрства, што з табою рабіць?». Не чытаючы артыкула, можна даць толькі адзін адказ: удасканальваць, паглыбляць. Няўжо хто-небудзь не згодзен? Але артыкул — не адцягненыя тэарэтычныя разважанні аб шляхах развіцця нашай маладой паэзіі, аб узроўні майстэрства нашых паэтаў, а канкрэтная гаворка пра новую кнігу вершаў Петруся Макаля «Акно».

Прыемна, што вопытны крытык, знаўца паэзіі, літаратар з уласным тонкім густам прызнае: «Пятрусь Макаль — таленавіты паэт, але...» Выходзіць, за гэтым «але» і пачынаецца сапраўдны Макаль, які «ад кнігі да кнігі ўсё больш і больш траціў усведамленне таго, што ўсё вартаснае ў паэзіі — незалежна, сюжэтная яна ці лірычная, «інтэлектуальная» ці «бытавая» — завязваецца ў абсягу, на грунце **непасрэднага** (падкрэслена Р. Бярозкіным) успрымання паэтам жыцця народа».

Катэгарычнасць і безапеляцыйнасць сцвярджэння, што паэт «ад кнігі да кнігі траціў усведамленне» адзіна правільных вытокаў паэзіі, мяне, чытача, адразу насцярожыла. Як жа так? «Пятрусь Макаль, — сцвярджае крытык, — адзін з таленавіцейшых прадстаўнікоў пакалення беларускіх паэтаў, што выступілі ў пачатку 50-х гадоў» дэградыруе ад кнігі да кнігі, «траціць грунт непасрэднага ўспрымання». Гэта ўжо трывога. Чаму? Дзе прычына няўхільных страт? Можа вінаваты духоўная спустошанасць, няведанне жыцця, нізкае майстэрства? Выходзіць, не. Адзін з вышэйшых разрадаў па кваліфікацыі «можна было б, не вагаючыся, прысвоіць Петрусю Макалю» сцвярджае Р. Бярозкін.

Адкуль жа такая супярэчлівасць у характары творчасці аднаго і таго ж паэта? Як стасуецца прызнанне таленту і высокага майстэрства з дэградацыяй творчасці? Мне ўспомніўся баксёр на рынгу. Ён спачатку ветліва ўсміхаецца, паціскае руку праціўніку і ўжо цікуе, як ямчэй звярнуць яму сківіцу і накаўціраваць.

Я пачынаю трывожыцца за паэта, якога даўно люблю за шчырасць, за жаданне не толькі «непасрэдна (ці можа спантанна?) успрыняць жыццё», але і асэнсаваць яго, за майстэрскае валоданне словам.

Пасля артыкула Р. Бярозкіна адразу бяруся чытаць кнігу «Акно». Усё чытанае ў перыёдыцы ў розны час не можа стварыць уражання цэльнасці, вызначыць грамадзянскую пазіцыю аўтара, раскрыць яго лірычны і проста чалавечы свет. Якраз гэтыя пытанні менш за ўсё цікавілі аўтара артыкула. Яго больш займала «апраўданасць і арганічнасць унутранага сугучча», «пераморгванне рыфмы з рыфмаю», метафара і перыфраз, «ход», «прыём».

Хачу, не думаючы пра артыкул Бярозкіна, прачытаць зборнік П. Макаля без зададзенай прадузятасці і катэгарычных ацэнак. Першы верш радуе празрыстасцю думкі, светлай прагай жыцця. У ім гучыць абурэнне пустазвонамі, гатовымі «ў нафасным уступе, як у ступе, ваду вядомых слоў таўчы штодня, пакуль алоўкам па стале не стукне, нібыта лёс няўмольны, старшыня». Можна прымаць ці не прымаць параўнанне старшыні з няўмольным лёсам або зварот да «таварыша бога». Тут справа густу. Мяне прываблівае ў многіх вершах П. Макаля паліфанічнасць слова, уменне ўзбагаціць і пашырыць гукапіс нашай мовы, рассунуць рамкі паэтычнага слоўніка. Усім ужо абрыдлі вершаваныя падробкі, у якіх можна падстаўляць рыфмы «сонца-бясконца», «гаі-салаўі», «мір-шыр». Пятрусь Макаль здзіўляе багаццем нечаканых рыфмаў, раскрываючы невычэрпныя магчымасці нашай лексікі. Гэта не лабараторныя практыкаванні, не самамэта, не слоўная эквілібрыстыка. Паглядзіце, як свежа і натуральна гучаць радкі, узбагачаныя не толькі майстэрствам, а і глыбокім пачуццём шчырага сэрца. Паэт гаворыць пра ветэранаў вайны, у якіх

Пад кашуляй цела,
Быццам ваенная карта,
Яе не згубіш ніколі.
Яна да скону з табою,
Як біяграфія болю.
Як геаграфія бою.
Адзначылі тут асколкі
Пасёлкі ад Волгі і Віслы.
На ордэнскай стужцы вясёлкі,
Медалем Зямля павісла.

У асобных вершах П. Макаля трапляецца не заўсёды апраўданая «тэхнічнасць», залішне адцягненая метафарычнасць, ёсць слабасці і хібы, як у большасці паэтаў. Недасканалыя радкі і строфы можна лёгка навысмыкваць для рэцэнзіі пэўнага кірунку і зрабіць выгляд, што нічога цікавага, свежага і шчырага ў кнізе няма. Можна і наадварот, на некалькіх удачах абгрунтаваць пенегірык. Мне ж хочацца разабрацца ў апошняй кнізе П. Макаля, дайсці да сутнасці яго паэзіі, адчуць яе сілу і слабасці. Чытаю і ўсё больш і больш пераконваюся, што кнігу пісаў не халодны, не абыякавы да хваляванняў нашага часу і да самых надзённых праблем жыцця майстра, а ўсхваляваны, добры і ўдумлівы паэт. Яму ўласціва захапленне формай, над якою ён адчуў сваю ўладу, захапленне багатаю моўнаю палітрай, разнастайнасцю рытмічных і інтанацыйных магчымасцей слова. Прыкладаў такога захаплення больш чым трэба прывёў у сваім артыкуле Р. Бярозкін і вызваліў мяне ад тае часткі, што звычайна пачынаецца пасля слабутага «але».

Паэзіяю Бярозкіна падзяляе Барыс Бур'ян у артыкуле «Паэтычныя іерогліфы і жывая душа паэзіі» («Літаратура і мастацтва» № 51). Не толькі падзяляе, а ў пэўнай ступені праясняе яе, знаходзіць агульныя хібы, уласцівыя паэтам так званага філалагічнага пакалення. Толькі хібы, толькі «дэманстрацыю рамесніцкага ўмельства і арыгінальнічання». Есць такі грэх у маладых паэтаў, але ж іх аб'ядноўвае імкненне да пошукаў, да вырашэння хвалюючых актуальных праблем. І кожны мае свае здабыткі, знаходкі і ўдачы. Але ў палемічным запале Р. Бярозкін і Б. Бур'ян бачаць толькі пралікі, толькі слабасці і няўдачы. Так, паэзія — жывая душа, з узлётамі і спадамі, з адкрыццямі, азарэннямі і стратамі. Як кожная душа — з радасцямі і засмучэннямі, сілаю і слабасцю.

Але я хачу гаварыць не столькі пра крытычныя артыкулы, колькі пра прадмет крытычнага запалу — пра кнігу вершаў П. Макаля. У ёй выразна чуецца пульс нашага часу, радасці, трывогі і хваляванні, блізкія кожнаму з нас. Паэт гаворыць па-свойму, вобразна і свежа.

Грузчык я.
Мяне хістае трохі.
Ад віна да позна валачы
З парахода штармавой эпохі
Цюк трывог смяротных
на плячы.

Паэту «штармавой эпохі» няма калі займацца заглыбленым самааналізам, вытанчаным замілаваннем успамінамі маленства, ён адчувае сябе сапёрам, абавязаным «абясшкодзіць беды, як тарпеды, што здаля нацэлены на нас», ён «сэрцам падключаны» да лініі высокага напружання людскіх клопатаў і турбот:

Дрэмле завязь у кветках —
Не прагледзь, чалавек!
У безразмерных шкарпэтках
Скача атамны век.
К д'яблу метры і мэтры! —
Твой апошні давіз...
Бачыш, — грыб у паветры
Безраэмерна павіс.

Чамусьці вельмі простыя радкі і думкі гэтага верша Р. Бярозкін успрымае «як рэбус, як галаваломку». А мне ўсё больш і больш хочацца цытаваць строфы і вершы з кнігі «Акно», радавацца ўдачам паэта, які ўмее ў драбніцах будзённага жыцця раскрыць пэўны грамадскі сэнс, выказаць свае адносіны да самых надзённых праблем і супярэчнасцей нашага часу.

Можна назваць дзесяткі вершаў, якія запамінаюцца свежасцю думкі, трасянасцю, нечаканай вобразнасцю і майстэрскім валоданнем словам. Піша П. Макаль пра балгарскія памідоры і чуеш, як ляскаюць «суставы састава», бачыш, як «цягнецца ветка чыгункі да Мінска грузнай галінкаю памідора». У афіцыянтцы ён просіць «на першае — кубак ласкі», на радзіме славутага партызана паэт убачыў «паркан, нібыта патранташ, які ў хвіліну ціхага адбою распераза ў і кінуў дзед Талаш, як грозны напамін, перад сабою». Разам з паэтам адчуваеш «водар тонкі, салодкі» хлеба маленства — малака.

Чытаеш старонку за старонкай, і пачуцці і думкі паэта становяцца тваімі пачуццямі, тваімі думкамі. Толькі чытаць трэба добразычліва, без раздражнення, не толькі спыняцца на агрэхах, а і радавацца ўдачам.

Пра каханне, пра самыя чыстыя пачуцці напісаны цэлыя тамы вершаў. Гэтую тэму не абмінуў і Пятрусь Макаль. Ён не абмяжоўваецца «шчырасцю і непасрэднасцю толькі ўласных пачуццяў», як піша Р. Бярозкін. Паэт спрабуе па-свойму асэнсаваць усю складанасць чалавечых адносін, з радасцямі і пакутамі, з болем і мяккім святлом узаемнага разумення і адданасці. Не кожны пошук прыносіць вялікія ўдачы ў гэтым цыкле: ёсць празмерная разважлівасць і занадта «густая» метафарычнасць, рацыяналістычныя радкі і строфы. Але не яны вызначаюць вартасці ўсяго раздзела. Не маючы магчымасці цалкам працытаваць лепшыя вершы, спашлюся хоць бы на такія радкі:

Мы прагнем акунуцца
ў цішыні,
Як жытнія зарняты
ў баразёнцы.
Якія, зазямліўшы карані,
Вяртаюцца калоссямі
да сонца.
. . . . . .
У шыбу дзень пастукае,
як друг.
Якому кожны дом бясконца
рады.
І ўжо ў адзіны неабдымны
круг
Сальюцца закаханых
далягляды.

Добраю назіральнасцю і свежасцю, вастрынёй думкі, часамі афарыстычнай дакладнасцю вылучаюцца многія вершы апошняга раздзела кнігі «Акно». Назаву толькі «Душ», «Пра вернасць», «Святло і гук», «Ода горлу», «Скарга цвіка». У іх — роздум над самымі надзённымі з'явамі і праблемамі нашага часу, ваяўнічы запал барацьбіта за «святло вялікай праўды нашай». Усё гэта, як прызнае крытык Р. Бярозкін, выказана «паўнагучнай, часта сцісла-афарыстычнай і заўсёды пругкай» паэтычнай мовай.

Чаго ж біць трывогу, што П. Макаль «ад кнігі да кнігі траціць усведамленне?..» Трэба кожную кнігу чытаць не з аднабаковым намерам. П. Макаль настойліва шукае, часам эксперыментуе, але не імкнецца пераймаць выпрабаваныя прыёмы і формы, якія да густу крытыкам і тонкім знаўцам паэзіі.

У вершах Петруся Макаля раскрываецца багаты і складаны свет маладога сучасніка, радасці і клопаты нашай велічнай і неспакойнай пары. Шкада, што вопытныя крытыкі не заўважылі новых здабыткаў у нялёгкай і сумленнай працы бясспрэчна таленавітага паэта і перакрэслілі яго цікавую, разнастайную, хоць і няроўную кнігу.

Нарэшце, вершы і кнігі пішуцца для чытачоў. Кожны аматар паэзіі ў «Акне» Макаля ўбачыць не цені, а, перш за ўсё, мяккае добрае святло паэзіі.

ДАСЛЕДУЮЦЬ МАЛАДЫЯ МОВАЗНАЎЦЫ

У выдавецтве «Навука і тэхніка» выйшаў зборнік «Лінгвістычныя даследаванні». У ім — працы маладых беларускіх лінгвістаў па актуальных праблемах беларускага і славянскага мовазнаўства.

Асноўнае месца ў кнізе займаюць даследаванні па розных пытаннях лексікалогіі і лексікаграфіі: аб семантычных адносінах паміж лексічнымі адзінкамі, аб іх размеркаванні ўнутры прадметна-сінтаксічных груп, аб сінаніміі сучаснай беларускай дыялектнай мовы.

І. Яшкін разглядае паходжанне і межы пашырэння асобных слоў. В. Лемцюгова і А. Прышчапчык аналізуюць структуру тэматычных назваў, вытокі мікратапонімаў, прапануючы новае рашэнне пытання аб паходжанні некаторых груп тапонімаў.

Рад артыкулаў прысвечаны беларускай фанетыцы. Даследчыкі разглядаюць паходжанне дзекання і цекання ў беларускай мове, зацвярдзення шыпячых і губных, выказваюць некаторыя меркаванні адносна прынцыпаў нашай арфаграфіі.

Асобныя артыкулы прысвечаны гісторыі беларускай мовы. Так, А. Булына даследуе віды надрадковых знакаў у старой беларускай графіцы, іх значэнне і ўжыванне, а П. Вярхоў піша аб станаўленні асабовых назоўнікаў жаночага роду.

У некаторых артыкулах разглядаецца граматычны лад беларускай мовы — недаследаваныя асаблівасці словаўтварэння, марфалогіі і сінтаксісу. Пра беларуска-літоўскія моўныя кантакты вядзе размову І. Кавальчук.

Многія пытанні ў даследаваннях разглядаюцца ўпершыню.

Яны афармляюць нашы кнігі

УЛЮБЁНЫЯ Ў ПАЭЗІЮ

Графікі Уладзімір і Міхаіл Басалыгі афармілі кніг не так ужо багата — дзесяткі два. Аднак лепшыя з гэтых работ пераканаўча сведчаць, што ў маладых мастакоў арыгінальны почырк, они імкнуцца па-свойму вырашаць выяўленчыя задачы.

Міхаіл цяпер вучыцца ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце. Уладзімір скончыў гэты ж інстытут два гады назад і працуе галоўным мастаком ва Упраўленні мастацкай прамысловасці Міністэрства мясцовай прамысловасці рэспублікі. Ён займаецца не толькі кніжнай графікай — нямала часу аддае разьбе па дрэву, стварэнню габеленаў, вырабаў з металу.

Над афармленнем кніг браты працуюць заўсёды разам, папярэдне абмеркаваўшы задуму ў цэлым і ў дэталях. Бывае, што Міхаіл афармляе ўсё выданне паводле эскізаў Уладзіміра.

Першай афармленай імі кнігай быў зборнік лірыкі Сяргея Грахоўскага «Памяць» (1965). Ужо ў гэтым выданні мастакі выявілі свае разуменне кнігі як цэласнага мастацкага арганізму. У вокладцы, суперах, франтыспісе, шмуцтытулах ім удалося падкрэсліць вядучыя ідэі творчасці паэта. У тонкіх лінейных малюнках было відаць імкненне паказаць чалавека ў непарыўнай сувязі з прыродай.

Затым былі афармлены зборнік вершаў С. Грахоўскага «Тры вымярэнні», чацвёрты раздзел зборніка А. Звонака «Россып», «Выбранае» М. Грамыкі і інш.

У ілюстрацыях да гэтых і да іншых кніжак Басалыгамі створаны паэтычны вобраз беларускай дзяўчыны. Ад кнігі да кнігі ён набывае ў мастакоў кожны раз новыя рысы, сярод якіх вядучыя — адухоўленасць, паэтычнасць.

Пры першым жа знаёмстве з ілюстрацыямі Басалыгаў бачыш іх відавочную трывалую сувязь з беларускай народнай творчасцю. Гэтая сувязь выяўляецца ў максімальна строгім скарыстанні элементаў народнага арчаменту, у тактоўным ужыванні дэталяў і прадметаў народнага побыту. Спашлюся хоць бы на афармленне кніжак «Лабжанка-рэчка» І. Бурсава і «Кастры Купалля» С. Пазнізніка.

Аб тым, што талент маладых мастакоў набывае сталасць, сведчыць афармленне лірычнага зборніка Н. Гілевіча «Перазовы». Створаны цэльны ансамбль кнігі. На дзіва тонкая па малюнку суперовкладка, дзе такія характэрныя для творчасці мастакоў вобразы беларускіх дзяўчат. Прываблівыя, стройныя, яны быццам сімвалізуюць тры раздзелы паэтычнай кнігі. За гэтую работу мастакі атрымалі дыплом Усесаюзнага конкурсу па мастацкаму афармленню кнігі ў 1967 г.

На шляху пошукаў, як вядома, бываюць і няўдачы. Так здарылася, мне здаецца, і з Басалыгамі, калі яны афармлялі зборнік паэзіі Л. Геніюш «Невадам з Нёмана». Тут усё зведзена да арнаментавання суперовкладкі, вокладкі, франтыспісу, тытульнага ліста і г. д. І хаця арнаментальнае афармленне кніжкі разнастайнае па матывах, фарбах, усё ж мастакам не ўдалося знайсці выяўленчае рашэнне кнігі, адэкватнае лірыцы паэтэсы.



На гэтым здымку вы бачыце братоў Міхася (злева) і Уладзіміра Басалыгаў.

Фота Ул. КРУКА.

Браты Басалыгі бясконца ўлюбёныя ў паэзію, у народную творчасць. Лепшае са створанага імі мае вытокі ў гэтых жыватворных крыніцах.

Р. БАДЗІН.

Паэтычная ПАВЕРКА

Ніна МАЦЯШ

У НАВАЛЬНІЦУ

Не навальніца —
светапрастаўленне...
Прыбілі ноч да долу перуны.
Пад шквальным ветрам дрэвы —
на калені!
І толькі стогнуць здушана яны.

А па сцяжынцы да здранцвелай
хаты,
Праз дзікі зырк ламаных бліскавіц,
Бяжыць дзяўчо. З каханым.
З вечарніц.
Два клічнікі вясны, жыццёвых
святаў!

■ ■ ■

Людзі кажуць, што праходзіць
боль,
Што яго няўмольны час сцірае.
Незнарок кранеш — і працінае
Сэрца зноў закаранелы боль.

Так на попел іншы раз глядзіш,
І здаецца, ён халодны, мёртвы.
Варухні ж — і пекане жарынка...

■ ■ ■

Галі ГАМПЕР

Ты і верыш, і ўсё ж не верыш,
Што не мае ніякіх пекаў,
Што бяда твая — чорны неруш...
Ты ўсміхаешся чалавеку!

Я то ведаю, як нялёгка,
Толькі ж трэба, о як нам трэба
Сваю долю, як парастак крохкі,
У руках сваіх выняньчыць трэба.

Кастусь ШАВЕЛЬ

РАННЕ

Спакойна спіць дарога палявая.
Над рэчкай зелень траў густых
і крохкіх.
Бляднее ў небе месяц,
і спявае,
Трапечацца жаўрук — жывая
кропка.
Ды рэактыўны самалёт таропка
Сівою стужкай неба спавівае.

Усякі гук спакойным раннем рэзкі:
Ці конь захроп, ці ўдод парушыць
цішу,
Ці нават тут, пры маладым
узлеску,
Пшанічны ветрык ніву ледзь
калыша.
А я адзін адным на ўзгорак
вышаў
І аглядаю гурт сваіх пярэстых.

А ні душы ў лагчыне пад гарою,
На тое ж рань, калі салодка
спіцца.
Ды не бяда: транзістар мой
са мною,
Вось-вось пярэйме хвалі са
сталіцы.



ЗВЫШ трох тысяч пастаянных чытачоў наведвае Чэрвеньскую раённую бібліятэку. Тут рэгулярна праводзяцца канферэнцыі чытачоў і тэматычныя вечары. Бібліятэка мае пярасоўны фонд. Я загадчыца, камсамолка Ала Чарнавец амаль кожны дзень бывае ў вёсках, дзе няма бібліятэк. У яе актыве звыш 1120 пастаянных чытачоў у сёлах раёна.

На здымку — загадчыца перасоўнага фонду Ала Чарнавец (справа) і студэнтка Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума Люба Новікава падбіраюць літаратуру аб Ул. І. Леніне для вёскі.

Фота Ул. САВІЧА. (БЕЛТА).

БІЯГРАФІЯ АДНОЙ ПЕСНІ

ГІСТОРЫЯ беларускай народнай песні «Што за хлопец, што за дзяўчына» ў тым выглядзе, у тым выкананні, у якім яна цяпер шырока вядома, пачалася параўнальна нядаўна. Знайшоў яе і ўпершыню запісаў, як і дзесяткі, сотні іншых народных песень, Рыгор Раманавіч Шырма. Ён падарыў сваю знаходку кампазітару Багатырову. Анатоль Васільевіч высока ацаніў жамчужыну народнай творчасці. Беручыся за апрацоўку песні, Багатыроў наважыўся захаваць і лад верша і, безумоўна, мелодыю, якая падкупляе сваёй мяккасцю, лірызмам.

Апрацоўка песні была закончана ў жніўні 1964 года. Яе пачала выконваць Беларуская дзяржаўная акадэмічная харавая капэла. З гэтага часу ў біяграфіі вядомай ужо не адзін дзесятак гадоў народнай песні пачаўся новы этап, які бязмежна пашырыў яе межы, прынёс ёй сапраўды ўсенародную вядомасць. Гэта і канцэртнае выкананне папулярнейшым у рэспубліцы калектывам, гэта і шматразовае гучанне песні па радыё і, нарэшце, запісы на пласцінках.

І вось параўнальна нядаўна сталі вядомы новыя цікавыя факты, звязаныя з самымі вытокамі, з нараджэннем песні. Сяргей Міхайлавіч Новік-Пяюн — знаўца і аматар беларускіх народных песень, паведаміў, што ў свой час сам добра быў знаёмы з аўтарам слоў песні «Што за хлопец, што за дзяўчына» і што гэты верш створаны ў вядомай ступені на аўтабіяграфічным матэрыяле.

Яна ўцякае з бацькавай хаты,
Хлопец з зялёнага гаю:
Дзяўчына з вёскі, Гэляй...
завецца.
Хлопца як звалі — не знаю... —

гаворыцца ў песні. І вось што ўспамінае Новік-Пяюн.

Гэта было ўвосень 1928 года. У Лявонавічы да Сяргея Міхайлавіча прыйшоў хлопец — навучэнец Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Ён сказаў, што родам з суседняй вёскі Тэкалаўшчына, і сарамліва папрасіў пачытаць яго вершы. На некаторых старонках унізе стаяў подпіс — Мікола Гуцько.

Сяргей Міхайлавіч быў звязаны ў гэты час з некаторымі прагрэсіўнымі віленскімі газетамі і часопісамі, сам друкаваўся. Яго зацікавілі вершы маладога паэта, і праз некалькі дзён яны разам паехалі ў Вільню. Абышлі некалькі рэдакцый. Сяргей Міхайлавіч, як і абяцаў, пазнаёміў Гуцько з некаторымі паэтамі і літаратурнымі крытыкамі. Новік-Пяюн да гэтага часу захоўвае сшытак, у які запісаў яму на памяць тры вершы Міколы Гуцько.

Хоць у тую памятную паездку ў Вільню Гуцько не ўдалося надрукаваць ні аднаго са сваіх вершаў, дамоў ён вярнуўся акрылены зычлівымі парадамі і з цвёрдым намерам працягваць пісаць. Прыблізна праз год, у 1929 годзе, Мікола напісаў сваю баладу «Што за хлопец, што за дзяўчына». Гэта была даніна яго захаплення паэзіяй Адама Міцкевіча. У баладзе Гуцько не цяжка заўважыць нават пераймання славутай міцкевічаўскай «Свіцязянкі». Прысвяціў Мікола свой верш Алене (Гэлі) Новік, дзяўчыне, у якую закахаўся.

Вядома, што Гуцько адаслаў потым баладу яшчэ з некалькімі вершамі ў адну з віленскіх газет. Дзе ж сустраўся Р. Шырма з вершам, перакладзеным ужо на песню? Рыгор Раманавіч добра памятае, што ўпершыню пачуў песню «Што за хлопец, што за дзяўчына» ў сёлах пад Навагрудкам. Гэта было ў канцы саракавых гадоў. Потым яму не раз даводзілася чуць песню на вечарынках, на спеўках пад Гродна, на Слонімшчыне. Іншы раз гэта былі, як успамінае Рыгор Раманавіч, варыянты запісаных ім тэкста і мелодыі.

Дык як усё-такі твор амаль невядомага паэта з-пад Нясвіжа аказаўся настолькі папулярны, лёг у аснову народнай песні? Справа ў тым, што адасланая ў Вільню балада Гуцько не загубілася ў рэдакцыйных сталах, а была праз некаторы час апублікавана ў кніжцы «Беларускага календара». Як прыпамінае Новік-Пяюн, гэта быў каляндар ці то за 1929, ці то за 1930 год.

Далейшы лёс верша Міколы Гуцько не цяжка ўявіць. Трапіўшы ў такое параўнальна шырокае для таго часу выданне, як каляндар, верш Гуцько палюбіўся людзям, стаў перавандроўваць на старонкі сшыткаў. Магчыма, кагосці ён і натхніў зрабіць напеў. Але імя аўтара балады забылі, песня ўспрымалася як народная.

А аўтар песні жыў, працаваў. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі Мікалай Аляксандравіч Гуцько настаўнічаў на Палессі. У гады Вялікай Айчыннай вайны партызаніў у атрадах на Капыльшчыне. Потым зноў настаўнічаў, працаваў дырэктарам васьмігадовай школы дома, у Лявонавічах. Цягу да паэзіі, да песень ён захаваў да апошніх дзён. Памёр Мікалай Аляксандравіч увосень 1967 года. На радзіме яго памятаюць як аднаго з арганізатараў, удзельніка і вялікага энтузіяста Лявонавіцкага народнага хору.

Вядомым паэтам Мікалай Аляксандравіч не стаў, хоць дочкі яго да гэтага часу захоўваюць вялікі сшытак вершаў і балад.

Але жыве песня «Што за хлопец, што за дзяўчына» — адна з самых папулярных у нас у рэспубліцы.

А. ГРЫЧАН.

ШТО пішуць ПРА НАС

«ЗОНТАГ» ПРА БЕЛАРУСКАЕ АПАВЯДАННЕ

Культурна-палітычны штотыднёвік Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі «Зонтаг» не раз знаёміў сваіх чытачоў з новымі творамі беларускіх пісьменнікаў. Прыемна адзначыць, што цікавасць нямецкіх сяброў да нашай літаратуры ўвесь час расце, пра што сведчаць і новыя пераклады, і крытычныя агляды, і рэцэнзіі ў перыядычным друку на новыя творы беларускіх літаратараў.

У сёлетнім 25 нумары «Зонтага» змешчана рэцэнзія Т. Н. Брарана «Анталогія беларускага апавядання. Мінск 1967» на двухтомнік апавяданняў, складзены С. Александровічам, Я. Скрыганам, М. Стральцовым і Т. Хадкевічам і выдадзены летась выдавецтвам «Беларусь». Аўтар рэцэнзіі характарызуе гэта выданне як «першую спробу паказаць складаны і поўны змен працэс развіцця беларускай навелістыкі ад пачатку стагоддзя да нашых дзён», як удалую дэманстрацыю «лепшых дасягненняў беларускай літаратуры ў жанры апавядання».

Развіваючы сваю думку, аўтар сцісла акрэслівае асаблівасці гэтага працэсу, творчыя напрамкі літаратурных плыняў і асобных прадстаўленых у анталогіі пісьменнікаў.

Т. Н. Браран піша: «Першыя пісьменнікі беларускага аднаўлення, якія яшчэ глядзелі на свет вачыма селяніна, у сваёй творчасці былі цесна прывязаны да рэалістычнага фальклору — казак і гумарэсак, якія былі шырока распаўсюджаны ў народзе. Батушэвіч і Галубок, часткова таксама Ядвігін Ш., адзін з самых таленавітых празаікаў дакастрычніцкай беларускай літаратуры, — прадстаўнікі гэтага напрамку. Іх апавяданні вызначаюцца трапнасцю жыццёвых сітуацый, гумарам. Псіхалагічная паглыбленасць — адметная рыса апавяданняў Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага і Змітрака Бядулі — пісьменнікаў, якія ўступілі ў літаратуру пасля рэвалюцыі 1905 года. Гэтыя аўтары далі канкрэтнае тлумачэнне многіх вельмі значных нацыянальных і сацыяльных жыццёвых пытанняў беларускага народа, што, дзякуючы рэвалюцыі, пранікі ў свядомасць шырокіх мас. Часам гэта давалася ў алегарычнай форме, як, напрыклад, у Ядвігіна Ш. і асабліва ў яркіх і лагічна завершаных Коласавых «Казках жыцця».

У напрамку, які вызначылі Колас, Гарэцкі і Бядуля, беларускае апавяданне развівалася і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Бурны росквіт нацыянальнага жыцця, а таксама праблемы, якія ўзніклі ў адносна адсталай краіне пры будаўніцтве сацыялізма, абумовілі пашырэнне традыцыйных жанраў. Так, народная байка і гумарэска атрымалі далейшае развіццё ў сатырычных апавяданнях Кандрата Крапівы; надзвычай узрасла роля аператыўнага жанру, які непасрэдна закранае жыццё, — нарыса, як у Міхася Чарота і Хвядоса Шынклера. Паявіліся і зусім новыя для беларускай літаратуры жанры, як напрыклад, палітычна-дэтэктыўнае апавяданне. Прыкметнай з'явай дваццатых гадоў стаў рамантычны ўзлёт маладых літаратараў, самымі таленавітымі з якіх былі Міхась Зарэцкі, Васіль Казаль і Сымон Барачавых. Сацыяльна-аналітычны кірунак вызначаў Платон Галавач.

Шырокі размах літаратурнага жыцця пасля XX з'езда КПСС прывёў да новага росквіту беларускай літаратуры. Пісьменнікі Янка Брыль і Васіль Быкаў сталі вядомы далёка за межамі сваёй краіны. Калі Янка Брыль пераважна паказвае жыццё Заходняй Беларусі ў перыяд паміж двума сусветнымі войнамі, дык Быкава больш цікавяць праблемы самой вайны, ёмістыя карціны якой ён намаляваў у сваіх творах. З больш маладога пакалення беларускіх пісьменнікаў несумненна цікавыя Адамчык, Караткевіч, Чыгрынаў і Стральцоў, якія аддаюць сваю ўвагу этычным праблемам жыцця».

Аўтар рэцэнзіі адзначае вялікую карыснасць выдадзенай анталогіі, якая «дае добрае ўяўленне аб шматгранным развіцці беларускай навелістычнай літаратуры ў яе агульным адзінстве і цэльнасці і дапамагае зразумець характар самога беларускага народа, яго гістарычныя шляхі, незайздросны жыццёвы лёс на працягу многіх стагоддзяў».

Л. КАДЗІН.

Павел Шыбут

Байкі-карацелькі

ПАКЛЁП

Карова напісала Аслу скаргу на Авадня, што ён не дае ёй спакою.

— Паклёп,— сказаў Асёл, прачытаўшы скаргу.— Хто гэта можа паверыць, каб меншы крыўдзіў большага?

ГУЛЬТАЙ

Калі ртутны слупок спыніўся на нулі, плюс і мінус аднагалосна назвалі яго гультаём.

НЕЗАДАВОЛЕНАСЦЬ

Аўтар абураўся:

— Мае творы нічым не адрозніваюцца ад іншых, а друкаваць іх не хочуць.

ПАТРАБАВАННЕ

Гадзіннік патрабаваў даплаты за ненарміраваную работу.

ДАКАЗАЎ

— Нарэшце-такі ты пераканалася, што поўзаць — не лятаць,— гаварыў чарвяк да мухі, якая заблыталася ў павуцінні

ЗНАЙШЛА ВЫЙСЦЕ

Курыца абуралася, што яе часам павучаюць яйкі. Ад абурэння яна перастала іх несці.

ПА-НОВАМУ

Старога вераб'я на мякіне не праводзілі. Яму падсыпалі канапель.

НЕ ДАГАДЗІЎ

— І не лез жа нікуды, а ўсё роўна выкінулі! — крычаў цвік.

АБУРЭННЕ

Трухлявы пень бурчаў:

— Няма догляду! Дзе ж тут вырасцеш!

НАВУКОВАЕ КІНО і СУЧАСНАСЦЬ

Ігар ВАСІЛЬКОЎ

Хоць канкрэтныя задачы савецкага навуковага кіно мяняліся ў залежнасці ад патрабаванняў часу, яно заўсёды імкнулася захаваць сваю важнейшую якасць — арыентацыю на шырокую аўдыторыю гледачоў.

Эпоха вялікіх навуковых і тэхнічных дасягненняў адкрыла навукова-папулярным фільмам яшчэ больш шырокую дарогу ў масавыя аўдыторыі і на экраны кінатэатраў. Гэта, у сваю чаргу, прад'явіла новыя, павышаныя патрабаванні да якасці стужак. Гаворка ідзе не толькі аб змесце, але і аб форме твораў: аб узроўні займальнасці, выразнасці, арыгінальнасці ў выкарыстанні выяўленчых сродкаў кіно, гэта значыць, аб тым, што мы ў цэлым разумеем як прафесіяналізм і майстэрства.

Сярод кінематаграфістаў, якія стварылі фільмы, адзначаныя арыгінальнай формай, свежым поглядам на матэрыял, — у нас і вопытныя заслужаныя майстры і прадстаўнікі маладога пакалення. Іх карціны розныя. Але ўсё ж можна ўбачыць і агульныя заканамернасці, выказаныя ў найбольш удалых творах.

Цяпер кінематаграфісты з поспехам пранікілі ў тую галіну, якая яшчэ нядаўна была здабыткам вучоных-гісторыкаў. Выкарыстоўваючы толькі скупыя выяўленчыя сродкі рукапіснага тэксту і дакументальнай фатаграфіі, яны ўводзяць гледача ў лабараторыю ленінскай думкі, узнаўляюць на экране жывы і хвалюючы вобраз Леніна — правадыра, змагара, мысліцеля. Такія навукова-папулярныя стужкі «Рукапісы Леніна» і «Сцяг партыі», створаныя рэжысёрам Ф. Цяпкіным па сцэнарыях Г. Фрадкіна.

Работа сцэнарыста В. Данілава і рэжысёра В. Архангельскага «Шыфр-Альфа-Тэта» праклала шлях яшчэ аднаму вельмі перспектыўнаму жанру ў навуковым кіно — фільмам-роздумам. Стваральнікі фільма пабудавалі яго як рэпартаж з пярэдняга краю навукі і зрабілі гледача саўдзельнікам роздумаў аб загадках мыслення.

Аўтары такіх фільмаў добра разумеюць, што іх твор — гэта не вучэбны дапаможнік, ён не можа і не павінен вучыць, а закліканы толькі далучаць гледача да навуковых ведаў, даць уяўленне аб тым ці іншым навуковым адкрыцці, аб яго значэнні для чалавецтва.

Трэба сказаць, што межы традыцыйных жанраў іншы раз так размыты, што ўсякія вызначэнні могуць аказацца недастаткова дакладнымі. Вось, напрыклад ,фільм «Мост», прысвечаны будаўніцтву. Здавалася б, не выйгрышная тэма. А тым часам у кожным эпізодзе гэтага фільма гледача чакае простатакі здзіўляючае адкрыццё. Здзіўляючае таму, што раскрываецца сутнасць нібыта вядомых усім паняццяў, якія на самай справе аказваюцца зусім невядомымі. І робіцца гэта ў спакойнай манеры дасціпнага апавядання, у жанры звычайнай кіналекцыі, якая не павучае, а проста захапляе гледача саўдзелам у даследаванні і дае сапраўдную радасць пазнання. У гэтым фільме няма ніякіх навацый у адносінах формы, і гэта апраўдана, таму што такія навацыі не былі прадыктаваны зместам.

Ёсць, вядома, прыклады і зусім іншага роду. Ужо гадоў дваццаць рабіліся беспаспяховыя спробы папулярызаваць з экрана хоць бы элементарныя асновы тэорыі адноснасці. Далей сцэнарыяў не ішло — яны атрымліваліся або невыносна спецыяльнымі і сумнымі, або вульгарызавалі самую тэорыю. Прывычныя формы кінапапулярызацыі былі непрыгодныя для такога зместу. І вось С. Лунгін, І. Нусінаў і С. Райтбург выступілі з фільмам «Што такое тэорыя адноснасці», у якім вельмі смела, дасціпна і, як сведчаць вучоныя, наогул удала вырашылі задачу. Для гэтага аўтары і рэжысёр выкарысталі новую для навуковага кіно форму — яны ўвасобілі навуковы змест у спрэчку-дыялог паміж дзеючымі асобамі іграваой навелы. Дыялог дзеючых асоб на навуковую тэму сюжэтна ў фільме даволі матываваны і таму глядач адчувае сябе ўдзельнікам спрэчкі, якая вядзецца на экране. Адсюль і нязменны поспех гэтага фільма ў любой аўдыторыі.

Савецкае навуковае кіно шукае зараз сродкі для ўвасаблення больш глыбокага і разнастайнага зместу. Агульны рух выяўленчых сродкаў пры гэтым накіраваны ад дыдактычнага пераказу з'яў, скажам, з дапамогай мультыплікацыйнай схемы да ёмкага вобразнага ўвасаблення гэтых з'яў.

Свет рэчаў, які акружае чалавека, хутка мяняецца. Натуральна, што зліццё тэхнічнага прагрэсу з прыкладной эстэтыкай павінна было паўплываць і на выяўленчыя сродкі навуковага кіно. На іх адбілася і характэрнае для сучаснага кінамастацтва імкненне да ўсякага роду дакументальнасці. І тут перш за ўсё трэба адзначыць тэхніку так званага «прамога кіно». Ужо ўстанавілася традыцыя абмяркоўваць праблемы «прамога кіно», ці то ў тэхнічным ці ў эстэтычным сэнсе, у дачыненні да дакументальнай кінематаграфіі. Між тым метад прамога назірання заўсёды быў адным з важных сродкаў у навукова-папулярным кіно, асабліва, калі фільмы ствараліся на матэрыяле навуковага кінадаследавання або навуковай дакументацыі.

Запаволенае і паскоранае здыманне, ультраскорасная апаратура, здыманне ў ультрафіялетавых і інфрачырвоных праменнях з дапамогай звычайных і ультрамікраскопаў; фотаконтрастны і люмінесцэнтны метады кіназдымкі; кінарэнтгеназдыманне і метад атрымання на экране адлюстраванняў, якія малююцца патокам электронаў у электронных мікраскопах, — такі далёка не поўны пералік сродкаў з арсенала навуковага кіно, сродкаў, якія яшчэ, на жаль, мала выкарыстоўваюцца і недастаткова распрацаваны. А між тым, толькі шырока карыстаючыся гэтымі сродкамі, можна ствараць такія фільмы аб навуцы, якія змогуць заваяваць гледача.

Вось тут і ўзнікае неабходнасць гаварыць аб велізарных магчымасцях і перспектывах «прамога кіно» ў навуковай кінематаграфіі, ужо не толькі як аб праблеме новай тэхнікі, а перш за ўсё як аб праблеме эстэтычнай.

Як у выяўленчым мастацтве наогул, так і ў мастацтве навуковай кінапапулярызацыі з'явы, што адлюстроўваюцца, павінны быць непасрэдна верагоднымі. Спачатку глядач павінен паверыць у тое, што адлюстроўваецца, а потым ужо разам з аўтарамі фільма палюбіць або зненавідзець, адчуць гордасць за чалавека, які пакарае прыроду, або проста адчуць задавальненне ад самога факта пазнання.

У фільме «Радзеюць воблакі», прысвечаным кіраванню надвор'ем, трэба было расказаць аб тым, як утвараецца град у воблаку. Але як гэта зрабіць? Прасцей за ўсё было намаляваць воблака і прымусіць найдрабнейшыя, таксама маляваныя, кропелькі туману «наглядна» скандэнсавацца ў буйныя зерні граду. Гледачу ўсё было б зразумела, але не выклікала б цікавасці. І аўтары фільма зразумелі гэта. Яны павялі гледача ў навуковую лабараторыю, дзе вучоныя ствараюць у асобных камерах штучныя воблакі. Аўтары дазволілі гледачу самому заглянуць у воблака і з дапамогай мікраскопа разгледзець звязаныя з градаўтварэннем і з выдзяленнем каласальных энергій працэсы, якія там адбываюцца. Глядач гэтага фільма не толькі пазнае, ён як бы ўключаецца ў навуковы пошук, хвалюецца разам з даследчыкамі; з'яўляецца «эфект прысутнасці», гэта значыць суперажывання.

Метад прамога кінаназірання не абмяжоўваецца, вядома, навуковымі лабараторыямі. Такім жа чынам у навуковым кіно можа асвойвацца розны матэрыял.

Цудоўны фільм «Мова жывёл», створаны нядаўна ўкраінскімі кінематаграфістамі, дазваляе гледачу заглянуць, у літаральным сэнсе гэтага слова, у самыя патаемныя куточкі прыроды, пазнаёміцца з найбольш цікавымі яе таямніцамі. Фільм уяўляе сабой серыю навел, створаных метадам даследавання. Пабываўшы ў пчаліным вуллі, у месцах масавага гнездавання птушак, у падземных лабірынтах мурашніка і ў царстве дэльфінаў, глядач не толькі атрымлівае адказ на ўзнікшыя ў яго пытанні, але і востра ўспрымае агульны эмацыянальны настрой твора. І адбываецца гэта таму, што аўтары фільма — сцэнарыст Ю. Алікаў і рэжысёр Ф. Собалеў не абмяжоўваюць сваю задачу паказам толькі пэўных біялагічных заканамернасцей, а эстэтычна асэнсоўваюць разнастайнасць форм, фарбаў, з'яў у жывой прыродзе. У выніку фільм набывае самастойнае эстэтычнае гучанне.

Тут мы наблізіліся да рубяжа, дзе адбываецца збліжэнне двух спосабаў пазнавання свету, якія, здавалася б, знаходзяцца на розных полюсах, — навуковага з мастацкім, кіно навукова-даследчага з кінамастацтвам.

Адсюль не вынікае, вядома, што цяпер усе навуковыя фільмы трэба здымаць толькі метадам прамога кінаназірання. Бо само па сабе «прамое кіно» дае нам толькі бясстрасную фіксацыю рэчаіснасці, а ўсё астатняе залежыць ад пазіцыі мастака.

Найбольш прыкметныя творчыя ўдачы апошняга часу звязаны з жанрам навукова-публіцыстычнага нарыса. Такія выдатныя фільмы, як «Чалавек і атам», «Чалавек і хлеб», «Шлях да антырэчыва» і многія іншыя, ярка афарбаваны актыўнымі аўтарскімі адносінамі да прадмета папулярызацыі.

Такія фільмы заўсёды карыстаюцца поспехам у гледачоў. І гэта даказвае, што жанр навуковай публіцыстыкі ў кіно нарадзіўся не ў выніку эстэтычных імкненняў асобных аўтараў і рэжысёраў, а народжаны самім жыццём, эпохай вялікай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Для савецкіх кінапапулярызатараў жанр навуковай публіцыстыкі — новая і вельмі абяцаючая старонка ў гісторыі навуковага кіно.

(АДН).

Помнікі нашага краю

МУЗЫЧНЫ АКОРД У КАМЕНІ



Выдатным узорам архітэктуры малых форм з'яўляецца паркавая альтанка ў Нароўлі. Яна пабудавана ў пачатку XIX стагоддзя.

У той час альтанка ўваходзіла ў ансамбль невялікага палаца сядзібнага комплексу на правым высокім беразе Прыпяці. Цяпер сядзіба значна перабудавана і часткова разбурана, змянілася і планіроўка тэрыторыі, парушылася і былая прасторава-кампазіцыйная сувязь паміж асобнымі элементамі забудовы.

Размяшчэнне паркавай альтанкі не выпадковае. Яна пастаўлена на ўзгорку ля лукавіны ракі і добра відаць тым, хто падплывае да Нароўлі. Гэта своеасаблівы маяк-арыенцір.

Вельмі цікавая альтанка і з архітэктурнага боку. Яна ўяўляе сабой трохярусную кампазицыю, якая шырока сустракаецца ў рускім і беларускім дойлідстве. У ёй ёсць і традыцыйныя, строга класічныя матывы, і ў той жа час майстар надаў ёй святочны характар, уласцівы многім творам ранейшага часу.

Кожны ярус альтанкі мае сваю будову, усе яны ўдала спалучаюцца між сабой. Першы ярус найбольш масіўны: яго вуглавыя часткі ў выглядзе контрфорсаў маюць буйныя русты. Такі прыём будовы яруса надае манументальнасць аснове помніка і садзейнічае яго ўстойлівасці. Другі ярус увасоблены ў больш лёгкіх формах: аркі і калоны ў тры чвэрці складаюць асноўны матыў выбранай кампазіцыі. Трэці ярус — гэта прыгожая васьмікалонная ратонда з купалам. Канструкцыя першага і другога ярусаў — крыжавыя скляпенні, трэцяга — плоскае пакрыццё. Калоны і вянчаючы купалок — пустацелыя.

Альтанка пабудавана з цэглы, потым атынкавана. Выдатна выкарыстаны ў ёй архітэктурна-скульптурныя дэталі, прыгожы дэкор збудавання.

Паркавая альтанка-вежа ў Нароўлі цікавая дасканаласцю сваіх прапорцый, стройнасцю форм. Гэты арыгінальны помнік архітэктуры беларускага класіцызму — нібы акамянелы музычны акорд.

Ул. ЧАНТУРЫЯ.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЕ ЗА РУБЯЖОМ

ЛАБАРАТОРЫІ ЛУЎРСКАГА МУЗЕЯ

Лабараторыя Луўра, як звычайна называюць «Інстытут навуковых даследаванняў у галіне жывапісу, мастацтва і археалогіі», займае трыццаць залаў на трох паверхах у памяшканні Луўрскага палаца.

Загадчыца лабараторыі, захавальніца музея пані Ур — поўная энтузіязму і любві да сваёй справы — расказвае: «Пасля пажару ў часы камуны гэтыя памяшканні доўга пуставалі, потым былі перароблены ў склад і завалены архіўнымі паперамі. Толькі ў 1960 годзе было вырашана заснаваць лабараторыю музея, якая размясцілася ў вялікіх залах».

Што яна сабой уяўляе? Лабараторыя нядаўна была аснашчана ультрасучаснай апаратурай. Складзены падрабязны каталог карцін, які ўключае 50 000 рэнтгенаграм твораў жывапісу і 50 000 кліішэ на шкле.

Любая карціна, або іншы твор мастацтва, што паступае ў гэтую своеасаблівую клініку, для тутэйшых работнікаў — пацыент, якому яшчэ не паставлены дыягназ. Перш чым прызначыць «лячэнне», карціну ўважліва аглядаюць. У хімічнай лабараторыі вывучаюцца знятыя з карцін крышачкі фарбаў. Гэта дае магчымасць вызначыць фарбавальнае рэчыва, грунт, на якім напісана карціна. Побач «прасвечваецца» скульптура. Старажытная скульптура мае свой спектр. Такім чынам, напрыклад, удалося ўстанавіць, што дзве рымскія знешне падобныя адна да адной бронзавыя статуі (адну з іх знайшлі ў Італіі, другую — у раёне французскага горада Макона) адліты з зусім рознага металу. Пры дапамозе ультрафіялетавых прамененняў спецыялісты выявілі на адным з палотнаў Шардэна чорныя плямы, якія нельга ўбачыць простым вокам. Гэта значыць, што ў гэтых мясцінах пад лакам была зноў пакладзена фарба. Дарэчы, дзякуючы ўжыванню ультрафіялетавых прамененняў, можна выявіць і подпіс сапраўднага аўтара той ці іншай карціны, схаваную пар наластаваннямі фарбаў. Так удалося ўстанавіць, што адна з прыпісваемых Шардэну карцін была на самой справе напісана яго сучаснікам мастаком Буньё. Пад уздзеяннем натрыю фарбы знікаюць, малюнак паступае больш выразна, што дазваляе лепш яго вывучыць. Што ж датычыцца даследавання пры бакавым святле, дык яно выяўляе на палатне пухіры і трэшчыны і ўнаводзе, патрэбна карціне дубліраванне халста або ўмацаванне на ім фарбаў. Дзякуючы выкарыстанню рэнтгенаўскіх прамененняў удаецца адрозніць напластаванні фарбаў, якія адносяцца да розных эпох, і выявіць адну карціну пад другой; так здарылася, напрыклад, з палатном мастака Дэруэ «Трыумф караля Генрыха IV», калі пад пластом фарбаў быў знойдзены незакончаны партрэт яго сястры.

Аддзяленне фізічных даследаванняў, аснашчанае навейшай апаратурай, занята аналізам твораў мастацтва з металу, кераміці і шкла. Храматаграфія дазваляе вызначыць арганічныя звязваючыя і фарбавальныя рэчывы, а таксама крышталёвую структуру таго ці іншага прадмета. Спецыяльны метад выяўляе ступень першага абпалу ганчарных вырабаў. (Так, напрыклад, даказана, што кераміку эпохі неаліту абпальвалі пры тэмпературы 500 градусаў). Рэстаўрацыйная лабараторыя Луўра мае сваю механічную майстэрню і фоталабараторыю.

Пасля вычарпальнага навуковага абследавання твор мастацтва паступае да захавальніка музея, які вызначае характар неабходнай рэстаўрацыйнай работы і дагляду. Важная дэталь: мастацтвазнаўцы ўсіх краін могуць знаёміцца з вынікамі праведзеных даследаванняў, а студэнты дапускаюцца да практычнай работы над гэтымі дакументамі. («Новости ЮНЕСКО»).

ДРУЖАЦЬ ХІМІКІ І РАДЫЁЖУРНАЛІСТЫ

На Усесаюзнай ударнай камсамольскай будоўлі — Гомельскім суперфасфатным заводзе — ёсць пакой вызной рэдакцыі Беларускага радыё. Дзяржаўны Камітэт Савета Міністраў БССР па радыёвяшчанню і тэлебачанні — шэф завода. Радыёжурналісты трымаюць руку на пульсе будоўлі. Надрыхтаваныя рэдакцыяй матэрыялы часта можна чуць у выпусках апошніх навін.

Днямі на заводзе адбыўся мітынг, прысвечаны падвядзенню вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва за другі квартал. Да будаўнікоў прыехалі госці — журналісты і эстрадны аркестр Беларускага радыё і тэлебачання.

На мітынгу галоўная ўзнагарода — пераходны сцяг і грашовая прэмія Дзяржаўнага Камітэта Савета Міністраў па радыёвяшчанню і тэлебачанні і Міністэрства прамысловага будаўніцтва БССР — быў уручаны ўчастку, якім кіруе т. Лябёдкін.

Потым госці выступілі з вялікім канцэртам.

ПЕРАД НАВАЛЬНІЦАЙ.

Фотаэцюд М. ГЕРАСІМОВІЧА.

POLSKA AGENCJA INTERPRESS для ЛіМа

АЎДЫТОРЫЯ — УСЯ ПОЛЬШЧА

ТРАДЫЦЫІ І ТЫПЫ ПОЛЬСКІХ ЛІТАРАТУРНЫХ КАБАРЭ

У герояў тэлевізійнага «Кабарэ двух немаладых джэнтльменаў» Ярэмія Пшыборы і Ежы Васоўскага традыцыйныя гартэнзіі ў пятлічках.

Фота Ф. МЫШКОЎСКАГА.

Традыцыі літаратурнага тэатра-кабарэ ў Польшчы такія моцныя, што іх можна лічыць ледзь не адметнай рысай нацыянальнай культуры. Мы, як грамадства, заўсёды былі краінай дасціпных людзей. Рэпертуар кабарэ ў нас вывучаюць — літаральна — у школе: у школьныя праграмы ўключаны «Словы» Тадэвуша Боя-Зеленскага, які пісаў для кракаўскага кабарэ пачатку XX стагоддзя «Зялёны шарык». «Словы» былі магутнай атакай супраць абывацельшчыны, але ім не чужая была і палітычна-грамадская праблематыка. Гэтыя рысы заўсёды вызначалі польскае літаратурнае кабарэ. Сярод яго былых перамог варта назваць кракаўскае кабарэ «Фіглікі» (1909 г., кіраўнік Арнольд Шыфман), варшаўскія «Чорны кот» (1918 г., кіраўнік Вінцэнты Рапацкі) і «Кві пра кво» (20-е гады, з ім супрацоўнічаў паэт Юліян Тувім).

У Народнай Польшчы традыцыі кабарэ знайшлі добрых прадаўжальнікаў — кампазітараў, акцёраў, спевакоў. А паколькі жыццё і свет пастаянна давалі ім тэмы, дык кабарэ квітнела і працягвае квітнець. Яно перажыло розныя перыяды, паддавалася розным модам, сярод якіх можна назваць, у прыватнасці, эпоху росквіту студэнцкіх кабарэ пасля 1956 года. Гэты перыяд даў нам многіх аўтараў і акцёраў, якія і сёння працуюць у прафесіянальных кабарэ. Усяго ў Польшчы каля 15 кабарэ. Некаторыя ў падборы тэкстаў наследуюць слаўным традыцыям «Кві пра кво» (варшаўскае кабарэ «У Лопека», кіраўніком якога з'яўляецца адзін са стаўпоў былога «Кві пра кво» Казімеж Крукоўскі, ці вроцлаўскае «Дымок з папяросы» пад кіраўніцтвам Войцеха Дзедушынскага). Ёсць сцэны, якія выраслі на глебе студэнцкіх традыцый, як Варшаўскі тэатр сатырыкаў, ёсць кабарэ асобных прафесіянальных груп, — напрыклад, модная цяпер варшаўская «Авечка».

Можна было б прывесці шмат назваў і зрабіць падрабязны аналіз індывідуальнага почырку розных калектываў і іх творчых мэт, але баюся, што гэта будзе не вельмі цікава замежнаму чытачу. Відаць, лепш ахарактарызаваць тры галоўныя кабарэ, не падобныя адно на адно. Непадабенства іх дасць найлепшае ўяўленне пра польскае кабарэ як з'яву ў цэлым. Дык вось, варшаўскі «Дудэк», кракаўская «Піўніца пад баранамі» і тэлевізійнае «Кабарэ двух немаладых джэнтльменаў».

Дудэк — гэта імя кіраўніка кабарэ Эдварда Дзявонскага, артыста варшаўскіх сцэн, героя многіх фільмаў («Героіка» Мунка), рэжысёра тэлевізійных праграм. Ён аб'яднаў вакол сябе групу сваіх калег, акцёраў варшаўскіх тэатраў і трэці год выступае са сваімі праграмамі на імправізаванай сцэне аднаго са сталічных кафэ. Публіка сядзіць за столікамі, афіцыянткі разносяць віно і марожанае, афармленне сцэны зусім умоўнае, музычнае суправаджэнне — два раялі. Тэксты для акцёраў пішуць прафесіянальныя гумарысты і сатырыкі. У тэатры няма вядучых аўтараў, таму тэматыка і рамкі сатыры вельмі шырокія — ад палітыкі да надзённасці, і ад лірычнай песні да каламбураў. Папулярнасць кабарэ, якое раз у паўгода паказвае новую праграму, грунтуецца на першакласным акцёрскім майстэрстве. Найбольш моцныя ў праграме — сольныя нумары, якія ператвараюцца ў спаборніцтва паміж карыфеямі. Перамагае той, у каго лепшы тэкст, хоць у «Дудэка» здараліся і такія сітуацыі, калі больш аплядысментаў даставалася акцёру, які тушыраваў сваім майстэрствам плоскасць маналога...

Супрацьлегласць «Дудэка» — «Піўніца пад баранамі». Гэта ўсё яшчэ намінальна самадзейны калектыў, і тэксты, з якімі ён выступае, таксама намінальна. Фальклорны клуб. Перадача з Львова. 15-30 — у эфіры — «Маладосць». Да 50-годдзя ВЛКСМ. Перадача з Сімферопаля. 19-30 — «Вяселле з умовай». Шырокаэкранны мастацкі фільм. 21-00 — «Сем інтэрв'ю ў кафэ «Селена». Тэлевізійны рэпартаж. 21-35 — «Магурэл». Фільм-канцэрт.

14 ліпеня

Першая праграма. 8-55 — праграма перадач. 9-00 — «На зарадку станавіся!» (М). 9-15 — тэлевізійныя навіны (М). 9-30 — «Будзільнік» (М). 10-00 — «Сёння — Дзень рыбака». Тэлевізійны календар (М). 10-30 — «Музей украінскага мастацтва». Перадача з Кіева. 11-00 — «Для вас, жанчыны». Перадача з Ленінграда. 11-30 — «Дзеловыя людзі». Мастацкі фільм (М). 12-50 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў «Умелыя рукі» (М). 13-20 — для школьнікаў. «Неверагодныя прыгоды Марыка Пегуса». Тэлевізійны мастацкі фільм. ПНР. Сёмая серыя (М). 13-50 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «У мораз твае дарогі». Перадача з Сімферопаля. 14-20 — «Музычны кіёск» (М). — 14-50 — у эфіры «Маладосць». Насустрач IX Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Сафіі. «Масква — Сафія» (М). 15-45 — дзіцячы экран. «Закалдаваны хлопчык». Мультыплікацыйны фільм. 16-30 — праграма каляровага тэлебачання (М). 18-00 — міжнародная таварыская сустрэча па лёгкай атлетыцы паміж камандамі СССР, ГДР, Польшчы. Перадача з Ленінграда. 19-30 — «Музычная шкатулка». 19-55 — першынство СССР па футболу. «Дынамо» (Мінск) — «Нафтчы» (Баку). Другі тайм. 21-15 — «Сем дзён». Міжнародная праграма (М). 22-00 — тэлевізійны спектакль (М). 23-30 — «Толькі факты». Праграма перадач. «Музычны маяк».

Другая праграма. 15-30 — «Тыдзень бланітнага экрана» (М). 15-45 — «Сельскі клуб». Перадача з Данецка. 19-30 — кінапраграма (М). 21-15 — М. Пагодзін. «Янтарныя каралі». Тэлевізійны спектакль. 1-я і 2-я часткі.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

12 ліпеня

Першая праграма. 10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Цуды прыроды» (М). 10-30 — «На палях краіны». (М). 11-00 — фестываль фільмаў, прысвечаных 50-годдзю ВЛКСМ. «Расказы пра юнацтва». Мастацкі фільм (М). 12-30 — «Эканамічная рэформа ў дзеянні» (М). 13-00 — для школьнікаў. «Неверагодныя прыгоды Марыка Пегуса». Тэлевізійны мастацкі фільм. ПНР. Пятая серыя (М). 17-00 — «Навіны». 17-10 — праграма перадач. 17-15 — для школьнікаў. «Кампазітары — дзецям» (М). 17-45 — «Па вашых просьбах». Канцэрт (М). 18-30 — «5+2». Штотыднёвы агляд. 19-00 — «Клуб кінападарожнікаў» (М). 20-00 — для школьнікаў. «Тарэадоры з Васюгоўкі». Тэлевізійны мастацкі фільм (М). 20-45 — музычны антракт (М). 21-00 — «Эстафета навін» (М). 22-00 — «Стракатыя апавяданні». Мастацкі фільм. 23-45 — «Толькі факты». Праграма перадач. «На сон надыходзячы». Музычная праграма.

Другая праграма. 18-30 — «Конкурс праводзіць лета». Рэпартаж з ВДНГ (М). 19-00 — дзіцячы экран. «Гарачы дзень гускі Бальбінкі». Мультыплікацыйны фільм. 20-25 — «Мараль пані Дульскай». Мастацкі фільм. 22-00 — «Фізкультура і спорт». Тэлевізійны часопіс (М). 22-45 — праграма каляровага тэлебачання. Канцэрт (М).

13 ліпеня

Першая праграма. 8-55 — праграма перадач. 9-00 — «Гімнастыка для ўсіх» (М). 9-45 — тэлевізійныя навіны (М). 10-00 — «З днём нараджэння!» (М). 10-30 — «Здароўе» (М). 11-00 — для дзяцей. «Па шчупаковаму загаду». Мастацкі фільм. 12-00 — тэлевізійны тэатр для дзяцей. Пенча Манчаў. «Зайчына школа». Лялечны спектакль. Перадача з Харкава. 12-50 — для школьнікаў. «Неверагодныя прыгоды Марыка Пегуса». Тэлевізійны мастацкі фільм. ПНР. Шостая серыя (М). 13-20 — «Творчасць маладых». Дзень Малдаўскай ССР на Усесаюзнай выстаўцы тэхнічнай і мастацкай творчасці навучэнцаў сістэмы прафтэхадукацыі (М). 13-50 — «Морз, сонца, паветра». Перадача з Тбілісі. 14-15 — «Гісторыя залатога туфлька». Мастацкі фільм (М). 15-30 — насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Творы беларускай савецкай літаратуры на кінаэкране». Перадача першая. 16-30 — праграма каляровага тэлебачання (М). 18-00 — міжнародныя таварыскія сустрэчы па лёгкай атлетыцы паміж камандамі СССР, ГДР і Польшчы. Перадача з Ленінграда. 19-15 — праграма каляровага тэлебачання. «На агеньчык» (М). 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-00 — «Капітан з Кёльна». Мастацкі фільм (М). 22-55 — тэлевізійныя навіны (М). 23-10 — праграма перадач. «Музычны маяк».

Другая праграма. 11-00 — «Крыніца». Фальклорны клуб. Перадача з Львова. 15-30 — у эфіры — «Маладосць». Да 50-годдзя ВЛКСМ. Перадача з Сімферопаля. 19-30 — «Вяселле з умовай». Шырокаэкранны мастацкі фільм. 21-00 — «Сем інтэрв'ю ў кафэ «Селена». Тэлевізійны рэпартаж. 21-35 — «Магурэл». Фільм-канцэрт.

14 ліпеня

Першая праграма. 8-55 — праграма перадач. 9-00 — «На зарадку станавіся!» (М). 9-15 — тэлевізійныя навіны (М). 9-30 — «Будзільнік» (М). 10-00 — «Сёння — Дзень рыбака». Тэлевізійны календар (М). 10-30 — «Музей украінскага мастацтва». Перадача з Кіева. 11-00 — «Для вас, жанчыны». Перадача з Ленінграда. 11-30 — «Дзеловыя людзі». Мастацкі фільм (М). 12-50 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў «Умелыя рукі» (М). 13-20 — для школьнікаў. «Неверагодныя прыгоды Марыка Пегуса». Тэлевізійны мастацкі фільм. ПНР. Сёмая серыя (М). 13-50 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «У мораз твае дарогі». Перадача з Сімферопаля. 14-20 — «Музычны кіёск» (М). — 14-50 — у эфіры «Маладосць». Насустрач IX Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Сафіі. «Масква — Сафія» (М). 15-45 — дзіцячы экран. «Закалдаваны хлопчык». Мультыплікацыйны фільм. 16-30 — праграма каляровага тэлебачання (М). 18-00 — міжнародная таварыская сустрэча па лёгкай атлетыцы паміж камандамі СССР, ГДР, Польшчы. Перадача з Ленінграда. 19-30 — «Музычная шкатулка». 19-55 — першынство СССР па футболу. «Дынамо» (Мінск) — «Нафтчы» (Баку). Другі тайм. 21-15 — «Сем дзён». Міжнародная праграма (М). 22-00 — тэлевізійны спектакль (М). 23-30 — «Толькі факты». Праграма перадач. «Музычны маяк».

Другая праграма. 15-30 — «Тыдзень бланітнага экрана» (М). 15-45 — «Сельскі клуб». Перадача з Данецка. 19-30 — кінапраграма (М). 21-15 — М. Пагодзін. «Янтарныя каралі». Тэлевізійны спектакль. 1-я і 2-я часткі.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ імя А. В. Луначарскага

АБ'ЯВЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА СКЛАДУ:

1. Кафедра фартэпіяна — старшы выкладчык — 1.
2. Кафедра духавых інструментаў — выкладчык (фагот) — 1.
3. Кафедра народных інструментаў — старшы выкладчык (баян) — 1.
4. Кафедра агульнага фартэпіяна — загадчык кафедры.

Заявы і дакументы, згодна з палажэннем аб конкурсах, накіроўваць на імя рэктара па адрасу: г. Мінск, Інтэрнацыянальная, 30.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання.

Даведкі па тэлефоне: 22-49-42, 22-14-03, 22-12-64, 22-96-71.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-23, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 01799